Новы Час | 29 чэрвеня 2018 | № 24 (587) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №6

Літаратурная Беларусь

Выпуск №6 (142) (чэрвень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Валерый Герасімаў: «Экслібрыс» да 100-годдзя БНР

Саюз беларускіх пісьменнікаў, арганізатар літаратурнага конкурсу «Экслібрыс», прысвечанага 100-годдзю Беларускай Народнай Рэспублікі, да 1 жніўня чакае ад маладых аўтараў творы гістарычнай тэматыкі.

Пра тое, як сябра журы конкурсу Валерый Герасімаў, дасведчаны бібліятэкар-бібліёграф, края- і кнігазнавец, пачаў цікавіцца гісторыяй і якія парады дае ўдзельнікам конкурсу — у нашым інтэрв'ю.

— Галоўная парада ад вас для ўдзельнікаў «Экслібрысу», што спрабуюць сябе ў гістарычнай тэматыцы, — якая яна?

— Шанаваць папярэднікаў, не губляць веру ў праўду і моцна трымацца нацыянальнага грунту. Усё было да нас і будзе пасля нас. Але ў беларусаў у гэтым свеце свая місія, ніхто іншы за нас яе не спраўдзіць.

Сапраўдны гісторык, аўтар гістарычнай белетрыстыкі, на мой погляд, павінен займаць і актыўную жыццёвую пазіцыю. Вы паглядзіце на першыя ўрады БНР і ССРБ. За рэдкім выключэннем іх чальцы не прафесійныя палітыкі і чыноўнікі, а вайскоўцы, літаратары, выдаўцы, настаўнікі. Але з якой пасіянарнасцю! Радзіма паклікала, і яны заклалі такія трывалыя падмуркі нашай дзяржаўнасці ў найноўшым часе.

Янка Серада, першы прэзідэнт БНР, пазней ствараў і ўзначальваў бібліятэку Інбелкульта. Кастусь Езавітаў, першы вайсковы міністр БНР, бібліяфіл і аматар беларускіх кніжных рарытэтаў, сабраў адну з узорных прыватных кніжніц па беларушчыне. Усевалад Ігнатоўскі, выбітны эсэр, наркамасветы БССР — першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук, аўтар адметных гістарычных дапаможнікаў…Часам самавукі, як Купала ці Ластоўскі, але паспрабуйце нават сёння пераўзысці гістарычна-культурніцкі ўзровень «Тутэйшых» ці «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі».

Наш будзіцель Мікола Ермаловіч, як і астатнія сучасныя адраджэнцы-навукоўцы не лічылі для сябе нечым ганебным удзельнічаць у практычнай палітыцы, калі справа датычыла адраджэння нацыі і дзяржавы. Таму сучасным аўтарам гістарычных прац я б да ўсяго параіў актыўна «несці ў народ» свой досвед і заўсёды быць гатовымі стаць за стырно кіраўніцтва дзяржавай, калі ў гэтым з'явіцца тэрміновая геапалітычная неабходнасць. Як бы пафасна, на першы погляд, гэта ні гучала. Кіраваць краінай павінны тыя, хто вядзе радавод яе дзяржаўнасці ад протабеларускіх плямёнаў V–VI стагоддзяў, а не ад 1917 года.

— Чым вас прывабіла даследаванне гісторыі? І чым прываблівае цяпер?

— Нармалёвы беларус, з нармалёвай сям'і, з нармалёвага беларускага места проста не можа не зацікавіцца гісторыяй. Так было і са мной. Старажытны Брагін 1147-га года першага згадвання ў летапісе. З дзяцінства — атмасфера замка Вішнявецкіх… Родны дом адразу за замкавым ровам, дзе аскепкі сярэднявечнага посуду і талеры ВКЛ ды барацінкі валяюцца проста пад нагамі. Плюс непазбыўнае пачуццё волі і справядлівасці, што ўласціва менавіта беларусам Падняпроўя ледзь не на генетычным узроўні. Усё астатняе — справа лёсу і выпадку. Цяпер — як бы адваротны працэс. Трэба аддаваць роднай зямельцы, што атрымаў.

> **Пасля вядомых падзей ў сярэдзіне 1990-х нацыянальнае адраджэнне прыняло форму грамадзянскай вайны. Толькі не ўзброенай, а ментальна-ідэалагічнай. На адным баку апынулася нацыянальная эліта, праслойка нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыі і духова здаровая частка «простага» народа. На другім — нашчадкі сталінскіх катаў**

У гэтым сэнсе для мяне вялікая загадка каста чыноўнікаў раённага (і не толькі) маштабу — у побыце — «у дошку свае хлопцы», якія ўчора тапталі разам з табой тыя ж сцяжынкі, гайсалі па тых жа гаях, узлазілі на тыя ж сівыя муры, а сёння пад сурдзінку пра ўпарадкаванне «малой радзімы» зносяць бульдозерамі драўляныя палескія хаты з унікальнымі малымі архітэктурнымі формамі, адметнасцямі і асаблівасцямі тысячагадовага традыцыйнага народнага дойлідства, руйнуюць гістарычную забудову і нявечаць гістарычную планіроўку старажытных паселішча… І пры гэтым захоўваюць усе анахраністычныя вуліцы Савецкія, помнікі Леніну, сувораўскія музеі і вучэльні ды змагаюцца з бел-чырвона-белым колерам на ўзроўні дэгенератызму…

— Хто з беларускіх аўтараў для вас аўтарытэт у гістарычнай тэматыцы?


— Мяркую, што да сярэдзіны 1980-х нацыя загаіла раны, фізічныя і духоўныя, пасля доўгіх гадоў русіфікацыі і рэпрэсій. Паўстала пакаленне ўнукаў Яна Пазняка, Адама Станкевіча, Кастуся Езавітава, Вацлава Ластоўскага, Вацлава Іваноўскага, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мы зламалі хрыбет звыродлівага камунізму, аднавілі беларускую дзяржаўнасць. БНФ, бел-чырвона-белы сцяг, Пагоня паўсталі нашымі сімваламі, ідэалогіяй, ментальнасцю. Зянон Пазняк, Алесь Адамовіч, Васіль Быкаў сталі нашымі абаронцамі і гарантамі незваротнасці працэсаў нацыянальнага адраджэння. На мой погляд, пасля вядомых падзей ў сярэдзіне 1990-х нацыянальнае адраджэнне прыняло форму грамадзянскай вайны. Толькі не ўзброенай, а ментальна-ідэалагічнай. На адным баку апынулася нацыянальная эліта, праслойка нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыі і духова здаровая частка «простага» народа. На другім — нашчадкі сталінскіх катаў, кампрадорская частка інтэлігенцыі, вайскова-інжынерна-люмпен-пралетарская пятая калона аскепкаў народна-гаспадарчай эсэсэсэраўскай імперыі. Ад Вясны 1996-га сілы нацыянальнага адраджэння вядуць цяжкія ар'ергардныя баі, баі адстойвання дзяржаўнай незалежнасці, роднай мовы і культуры. І ў гэтых баях працэсы люстрацыі, іншымі словамі, пераследу людзей (нягледзячы на прафесійны досвед) за палітычныя погляды шляхам звальнення з працы і да т.п., адыгрываюць немалую ролю.

Тут на нацыянальна арыентаваных гісторыках і пісьменніках улада «адарвалася» напоўніцу. Але гісторыю не паравернеш на свой капыл. Ды і беларусы сёння — не статак баранаў. Мне падаецца, нацыянальны супраціў негвалтоўнага характару якраз меў вынікам усплёск развіцця гістарычнай кнігі — і прафесійнай, і белетрыстычнай, і мастацкай. Гэта ўжо нават не дзясяткі, а сотні імёнаў. Нават пералічваць не буду, усе яны на слыху, у кожнага свая чытацкая ды інфармацыйная аўдыторыя.

— Чаго вы чакаеце як крытык і сябра журы «Экслібрыса» ад аўтараў, чые творы будзеце ацэньваць? Ці ёсць у вас ужо цяпер пэўны набор крытэраў?

— Гістарычнасць, мастацкасць, нацыянальная пазіцыя, — вось і ўсе крытэрыі. Гэта вялізны гонар і адказнасць для кожнага аўтара — удзельнічаць у конкурсе «Экслібрыс». Нягледзячы на тое, пачатковец ён ці слынны творца. Бо арганізатар конкурсу — Саюз беларускіх пісьменнікаў, тая творчая арганізацыя, якая ці не асноўны цяпер гарант незнікнення беларусаў у цывілізацыйнай прасторы. Помніцца, пасля таго, як у Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, дзе я працаваў загадчыкам аддзела старадрукаў і рэдкіх выданняў, пачалі нішчыць нацыянальна арыентаваныя гістарычна-кнігазнаўчыя праекты, а мяне звольнілі, праваабаронца Алесь Бяляцкі сказаў: «Нічога, сябра, увогуле добра і так, што ты за столькі гадоў працы ва ўрадавай установе не скурвіўся». Вось і Саюз беларускіх пісьменнікаў «не скурвіўся», нягледзячы на шматлікія спробы расколу і правакацыі з боку вядомых сілаў. Таму яго апека і ўвага дарагога каштуе.

Падрыхтавала Алена Босава



Набор заявак на прэмію імя Наталлі Арсенневай

Літаратурная прэмія імя Наталлі Арсенневай ушаноўвае аўтара ці аўтарку найлепшай паэтычнай кнігі на беларускай мове.

Арганізатары прэміі — Саюз беларускіх пісьменнікаў, Беларускі ПЭН-цэнтр і Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». Узнагарода ўручаецца пры падтрымцы Фонда культуры і адукацыі Орса-Рамана і Харытатыўнага фонда Згуртавання беларусаў Вялікай Брытаніі.



У склад журы прэміі сёлета ўваходзяць:

- Анатоль Івашчанка, паэт, літаратуразнаўца;
- Вольга Іпатава, пісьменніца, перакладчыца;
- Наста Кудасава, паэтка;
- Дзмітрый Строцаў, паэт;
- Андрэй Хадановіч, паэт, перакладчык.

Правам намінавання валодаюць выдаўцы, творчыя аб'яднанні, аргкамітэт Прэміі, сябры журы і самі аўтары.

Удзельнічаць у сёлетнім конкурсе могуць паэтычныя кнігі, напісаныя на беларускай мове і выдадзеныя ў электронным ці папяровым выглядзе ў 2017 годзе.

Заяўка павінна ўтрымліваць наступныя звесткі:

а) інфармацыя пра намінатара, што вылучае твор на Прэмію: кантактныя нумары тэлефонаў і адрасы;

б) назва кнігі, выдавецтва, месца і год выдання;

в) імя (імёны) паэта/паэткі, па магчымасці кантактныя дадзеныя;

г) электронныя pdf-версіі выданняў і, калі кніга выдавалася ў папяровым выглядзе, мінімум два папяровыя асобнікі кніг. Папяровыя асобнікі прымаюцца па адрасе Саюза беларускіх пісьменнікаў (Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, 31-906), электронныя варыянты — на адрас: paezija@gmail.com.

Заяўкі прымаюцца да 10 ліпеня.

Прэмія заснаваная ў гонар беларускай паэткі Наталлі Арсенневай (1903—1997) у 2017 годзе. Першым лаўрэатам прэміі стаў Уладзімір Някляеў за зборнік паэзіі «Толькі вершы».

Еўрапейскія пісьменнікі сабраліся ў Мінску

У паседжанні Генеральнай асамблеі Еўрапейскай Пісьменніцкай Рады (European Writers' Council) узялі ўдзел 32 кіраўнікі пісьменніцкіх арганізацый з Англіі, Беларусі, Даніі, Кіпра, Германіі, Гішпаніі, Ісландыі, Каталоніі, Латвіі, Нарвегіі, Славеніі, Харватыі, Фінляндыі, Швецыі, Эстоніі.



Гэтая асацыяцыя існуе з 1977 года і аб'ядноўвае 44 літаратурныя арганізацыі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, у тым ліку і Саюз беларускіх пісьменнікаў.

Асамблея ўпершыню праходзіла на постсавецкай прасторы.

Саюз беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца правадзейным чальцом Еўрапейскай Пісьменніцкай Рады з 2010 года.

З прывітальным словам да замежных гасцей і дакладам пра дзейнасць СБП выступілі старшыня арганізацыі Барыс Пятровіч (Сачанка) і сакратар Сюзанна Паўкштэла.

Асамблея працягнула сваю працу і на наступны дзень. У праграме была прэзентацыя зборніка маладых беларускіх паэтаў у перакладзе на англійскую мову.

Другі дзень працы Генеральнай асамблеі Еўрапейскай Пісьменніцкай Рады распачаўся з дыялогу Барыса Пятровіча (Сачанкі) з прэзідэнтам EWC Гунарам Ардэліусам.

У гутарцы, да якой далучыліся ўсе прысутныя замежныя ўдзельнікі кангрэсу, закраналіся пытанні аўтарскага права ў Беларусі, статусу пісьменніка і становішча беларускай мовы ў нашай краіне, пытанні кнігавыдавецкай справы, наладжванне міжкультурнага супрацоўніцтва і ўзаемныя пераклады мастацкай літаратуры.

Саюз беларускіх пісьменнікаў прадставіў гасцям зборнік-білінгву «Зацішша не было: Беларуская паэзія новай генерацыі» — пераклады сучаснай беларускай паэзіі на англійскую мову, укладальнікам і аўтарам прадмовы якога стаў крытык Ціхан Чарнякевіч. У брашуру ўвайшлі вершы 9 паэтаў і паэтак 1980-х гадоў нараджэння, якія прэзентуюць, па словах спадара Ціхана, «пакаленне антыманіфесту» ў беларускай літаратуры.

Са сваімі вершамі ў арыгінале і ў перакладзе выступілі на сустрэчы пяцёра «маладзёнаў»: Ганна Комар, Наста Кудасава, Таццяна Нядбай, Віталь Рыжкоў, Віка Трэнас. Яшчэ чацвёрка, якая ўвайшла ў кнігу: Андрэй Адамовіч, Ірына Бельская, Марыя Мартысевіч, Вальжына Морт.

Тэксты на англійскую мову для зборніка перастварылі ўжо згаданыя Ганна Комар і Вальжына Морт, Хілары Шырз, рэдагаваў пераклады Джым Дынглі.

Кожны з удзельнікаў асамблеі атрымаў новы зборнік у падарунак.

Тэкст і фота: Віка Трэнас

Прэмія імя Карласа Шэрмана: трэці сезон

Прэмія імя Карласа Шэрмана ўручаецца за найлепшы пераклад мастацкай кнігі на беларускую мову. Пераможца атрымае чэк на суму, эквівалентную 2000 у.а. Падаць заяўку можна да 10 ліпеня. Удзельнічаць у конкурсе могуць пераклады мастацкіх кніг на беларускую мову, выдадзеныя ў папяровым або электронным варыянце ў 2017 годзе.

Правам намінавання на Прэмію валодаюць выдаўцы, творчыя аб'яднанні, аргкамітэт Прэміі, сябры журы і самі перакладчыкі. Заяўка павінна ўтрымліваць наступную інфармацыю:

а) інфармацыя пра намінатара, што вылучае твор на Прэмію: кантактныя нумары тэлефонаў і адрасы;

б) назву кнігі, выдавецтва, месца і год выдання; в) імя (імёны) перакладчыка/цы (перакладчыкаў) і па магчымасці іх кантактныя дадзеныя; г) электронныя pdf-версіі выданняў і, калі кніга выдавалася ў папяровым выглядзе, мінімум два папяровыя асобнікі кніг.

Папяровыя асобнікі прымаюцца па адрасе Саюза беларускіх пісьменнікаў (220012, Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, 31-906), электронныя варыянты — на адрас: konkurs.pierakladau@gmail.com.

Заяўкі, дасланыя пасля 10 ліпеня, да разгляду не прымаюцца.

Сёлета ў склад журы прэміі ўваходзяць Лявон Баршчэўскі, перакладчык, філолаг; Ганна Бутырчык, філолаг, загадчыца кафедры «Гісторыя замежнай літаратуры» БДУ; Аксана Данільчык; паэтка, перакладчыца; Дзьмітрый Плакс, перакладчык, паэт і празаік; Марына Шода, перакладчыца, літаратуразнаўца.

Прэмія за найлепшую перакладную кнігу заснаваная ў 2016 годзе ў гонар выдатнага беларускага літаратурнага перакладчыка Карласа Шэрмана (1934–2005) і носіць яго імя.

Сузаснавальнікамі прэміі з'яўляюцца Беларускі ПЭН-цэнтр, Саюз беларускіх пісьменнікаў і Міжнародны дабрачынны фонд «Вяртанне». Пераможца прэміі атрымлівае ад Дабрачыннага фонду «Вяртанне» чэк на суму, эквівалентную 2000 у.а.

Заява Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў па сітуацыі ў Курапатах

6 чэрвеня, фактычна ў трыццатую гадавіну першай публікацыі праўды пра Курапацкую трагедыю ў пісьменніцкім тыднёвіку «Літаратура і мастацтва», непасрэдна каля месца ўшанавання і грамадскага мемарыялу па ахвярах сталінскіх забойстваў, насуперак негатыўнаму стаўленню грамадскасці, быў адчынены забаўляльны комплекс-рэстаран «Поедем, поедим».

Цягам некалькіх гадоў дэмакратычная супольнасць праводзіла маніторынг дзейнасці ўласнікаў рэстарана і рэагавала на ўсе спробы яго адкрыцця, а пасля таго, як гэта ўсё-такі здарылася, распачала бестэрміновую акцыю негвалтоўнага супраціву.

Рада Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў», разам з усёй неабыякавай грамадскасцю, выказвае рашучы пратэст з нагоды ганебнай падзеі — адкрыцця рэстарана «Поедем, поедим», наведнікі якога будуць харчавацца і танчыць побач з лесам памятных крыжоў курапацкага мемарыялу. Такой ганьбы не зведвала ніводнае месца памяці ахвяр, ніводзін мемарыял у свеце: забудова вакол іх заўсёды і неадменна плануецца з улікам меркаванняў супольнасці, у тым ліку меркаванняў маральна-этычных, якія, як мы вымушаны адзначыць, вельмі рэдка ўлічваюцца ў Беларусі ў дачыненні ахвяр сталінскіх рэпрэсій. З другога боку, ніводзін забаўляльны рэстаран не адкрыецца ў Хатыні, Трасцянцы, як не адкрыты ён у Асвенцыме ці Майданаку. Але ў Курапатах, дзе былі расстраляныя сотні беларускіх паэтаў, празаікаў, акцёраў і навукоўцаў, дзясяткі тысяч дагэтуль невядомых людзей, такая знявага па-ранейшаму магчымая...

Шануючы правы прыватнай уласнасці, мы заклікаем уладальнікаў зямлі, на якой збудаваны комплекс, да шырокага грамадскага дыялогу, у выніку якога будуць выпрацаваны захады да дээскалацыі грамадскага канфлікту і ўлічаны ўсе інтарэсы.

Мы ўпэўненыя, што з усіх бакоў ёсць людзі, для якіх пашана да продкаў, а тым больш да бязвінных ахвяраў, — святое. Гэта ў спрадвечных традыцыях, у самім характары беларусаў, што і мусіць стаць вырашальным у канфлікце, які склаўся вакол нацыянальнага мемарыялу «Курапаты». Памяць пра сотні тысяч загінулых, знішчаных сыноў і дачок Беларусі патрабуе ад нас стварэння ў Курапатах Музея ахвяраў бальшавіцкіх рэпрэсій.

Аксак Валянціна
Алексіевіч Святлана
Аляхновіч Мікола
Арлоў Уладзімір
Багдановіч Ірына
Баравікова Раіса
Бароўскі Анатоль
Брава Алена
Васючэнка Пятро
Вярцінскі Анатоль
Голуб Юрка
Дайнека Леанід
Далідовіч Генрых
Дранько-Майсюк Леанід
Дубатоўка Валянцін
Дубянецкая Галіна
Жук Аляксандр
Жуковіч Васіль
Жыбуль Віктар
Законнікаў Сяргей
Зуёнак Васіль
Казько Віктар
Карамазаў Віктар
Каржанеўская Галіна
Клімковіч Максім
Лазебная Анастасія
Някляеў Уладзімір
Пашкевіч Алесь
Пятровіч (Сачанка) Барыс
Рагойша Вячаслаў
Сіўчыкаў Уладзімір
Скобла Міхась
Спрынчан Аксана
Сцебуракa Усевалад
Федарэнка Андрэй
Хадановіч Андрэй
Хатэнка Антаніна
Цвірка Кастусь
Яцкоў Мікола

Прэс-служба ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў»

Першая публікацыя



Уладзімір МАРОЗ

Я пачаў пісаць у дзявятым класе, год ішоў 1968-ы. Больш звыкла і зразумела гэта можна было б назваць дзённікам, але такая форма найперш мае на ўвазе занатоўванне падзей. Думаю, што ў маіх запісах былі далёка не адны падзеі, а назіранні, разважанні, роздумы, абагульненні. Чаму думаю-мяркую, а не сцвярджаю пэўна? Тры тоўстыя агульныя сшыткі ў клетку, якія я спісаў дробным каліграфічным почыркам (у кожнай клетачцы радок) за тры з гакам гады (канец школы і паўтара курса інстытута), згарэлі падчас пажару разам з дзедавай хатай. Так, трымаў я іх у бабы з дзедам у Мікалаеўшчыне. Напэўна таму, што бліжэй у два разы да Мінска, чым бацькоўскае Даманава, ды і бываў я там нашмат часцей.

Гэтая сітуацыя ёсць у аповедзе, які так і называецца: «Тры сшыткі». Але тыхчасовыя запісы там не згадваюцца. Я іх рабіў ужо без перапынкаў (хоць і не рэгулярна), проста ў новым сшытку: «...вялікая для мяне страта — тры мае сшыткі. Недзе плывуць аблокам. Яны нясуць у сабе бачанае мною — але ж яны бачаць цяпер больш, чым я» (18 жніўня 1972 года, пятніца, Даманава).

Вось так стала рэагаваў на нечаканую падзею ў сваім жыцці дзевятнаццацігадовы хлопец, ці юнак, ці проста малады чалавек. Які, як цяперша бачыцца, без пісання ўжо не ўяўляў свайго існавання, хоць вучыўся на архітэктара. Вучыўся з цікавасцю, з імпэтам, з сялянскім жаданнем ухапіць чым больш у гэтыя студэнцкія гады.

Горадабудаўніцтва, уласна, асноўны прадмет для студэнтаў маёй групы горадабудаўнікоў, выкладаў у нас Навум Яфімавіч Трахтэнберг, дацэнт. Збольшага мы ведалі, што ён з'яўляецца адным з аўтараў генплана пасляваеннага Мінска, але да ўсведамлення архітэктурнага працэсу ў Беларусі як адметнай паслядоўнай справы з пэўнымі імёнамі яшчэ не даспелі. Ле Карбюзье — во дзе сапраўдны геній! А што тут нашыя, мясцовыя? Юнацкая неабачлівасць, адным словам. Але вывучалі ў інстытуце такія, якія ёсць, іх не выпішаш з-за мяжы. Таму, калі ў пачатку вясновай сесіі на другім курсе Трахтэнберг запытаўся, ці не жадае хто заняцца навуковай працай (студэнцкай, зразумела!), я адгукнуўся. А каб не сумна было аднаму, прапанаваў супрацу свайму сябру Колю Дзятко, хоць адразу разумеў, што пісаць (выкладаць думкі на паперы) давядзецца мне аднаму.

За тры гады мы напісалі тры работы. Ад інстытута нас накіравалі на XX студэнцкую навукова-тэхнічную канферэнцыю ВНУ Прыбалтыйскіх рэспублік, Беларускай ССР і Малдаўскай ССР, якая ў той 1974 год праходзіла ў Таліне.

Жылі мы ці не ў «Віру», шыкоўным савецкім толькі што пабудаваным шматпавярховым гатэлі, які ўжо тады ўвайшоў у гісторыю як першы эстонскі небаграй (хмарачос) і самы прэстыжны гатэль у рэгіён. Хваляваліся, натуральна, перад выступам, слухалі іншых. Помніцца дыскатэка ў політэхнічным інстытуце, які быў гаспадарам канферэнцыі. Першы раз сутыкнуліся з такой праявай, што запрашэнне на танец абазначае адразу на два: хуткі і павольны.

Тут, у Таліне, я і трымаў у руках сваю першую публікацыю. Тоненькая брашура з праграмаю, дзе на авантытуле чырвоным колерам быў адбіты камсамольскі значок і напісаны словы «50-годдзю надання камсамолу імя У.І.Леніна прысвячаецца» (1200 асобнікаў), і тоўстая, уласна кніжка, з тэзісамі дакладаў накладам 700 асобнікаў.

Тую тэму я працягваў і ў дыпломнай працы, праектаваў новы горад навукі. Кіраўніком быў Навум Яфімавіч. Праект ішоў без асаблівых узрушэнняў і турзаніны, дзесяць падрамнікаў метр на метр памерам пакрысе запаўняліся візуальным увасабленнем задуманага-перадуманага. Праект атрымаўся і нават быў адзначаны на ўсесаюзным узроўні, аб чым сведчыць «ДЫПЛОМ трэцяй ступені Саюза архітэктараў СССР...».

У 1976 годзе дацэнт Трахтэнберг па незразумелых прычынах пакінуў выкладчыцкую працу ў БПІ, якой займаўся з 1954 года, а ў 1977-м памёр яшчэ не старым чалавекам на 67-м годзе жыцця. Цяпер пішуць, што ў яго тады былі няпросты перыяд жыцця, нейкія непаразуменні-праблемы, што і паўплывала на заўчасны зыход... Згадка аб першай публікацыі паклікала ўспаміны аб настаўніку ў прафесіі, якую я набываў на архітэктурным факультэце. Залысіны, высокі лоб. Разумныя вочы за акулярамі. Сівыя валасы. Навум Яфімавіч шмат курыў, і толькі папяросы. Былі мы і ў яго дома, які месціўся на скрыжаванні вуліцы Захарава і Вайсковага завулка. Я ўпершыню бачыў такі агромністы пакой-кабінет, сцены якога выходзілі на абодва бакі дома, а акно было на зрэзе вугла.

Зразумела і бясспрэчна, што асоба Навума Трахтэнберга ў беларускім горадабудаўніцтве значная: ён праектаваў у свой час (больш за трыццаць гадоў!) усе генпланы Мінска. Мяняліся кіраўнікі праектаў і склад калектываў, нязменным заставалася прозвішча архітэктара Трахтэнберга. Уласна, савецкі Ленінскі праспект Мінска ў планіровачным вырашэнні — гэта яго плён. Нездарма ў 1968 годзе далі першую Дзяржаўную прэмію БССР за архітэктуру (якраз за архітэктуру Ленінскага праспекта), і сярод шасці асоб было і прозвішча Трахтэнберга.

Але ж быў у творчай біяграфіі майстра і будынак, узведзены па яго праекце! Толькі ў савецкі час ніхто аб гэтым не ведаў. Зразумела, найперш не хацеў гаварыць аб гэтым сам аўтар — часы не тыя. Навум Трахтэнберг нарадзіўся ў 1910 годзе ва Украіне, скончыў інстытут у Адэсе і працаваў там у філіяле Гіпраграда УССР. У 1934 годзе па запрашэнні «Белдзяржпраекта» пераехаў у Мінск. Відавочна, сваіх спецыялістаў-горадабудаўнікоў у нас тады не было. Дык вось, у гэтым жа годзе ў далёкім Бірабіджане, сталіцы Яўрэйскай аўтаномнай вобласці, па праекце Навума Трахтэнберга быў узведзены трохпавярховы будынак гарсавета. Аўтару было ўсяго 24 гады!

Калі Навум Яфімавіч памёр, я ўжо працаваў у «Мінскпраекце». Даведаўся выпадкова, што развітанне будзе ў Доме архітэктара на Карла Маркса. Чамусьці ні з кім з нашых хаўрусу не было. Я прыходзіў туды адзін, купіў кветкі, развітаўся. Здаецца, зайшоў потым некуды ды выпіў сто грамаў за супакой яго душы...

Другая мая «першая публікацыя» сталася як бы працягам студэнцкай навуковай работы, але ўжо без кіраўніка. Бо тычылася архітэктуры, па-першае, па-другое, жаданне пісаць аніколі не знікла і пасля інстытута. Матэрыял, якому прыдумалася назва «На шляхах памяці», быў надрукаваны ў ЛіМе 6 лютага 1976 года і прысвечаны конкурсу на праект мемарыяльнага комплексу «Партызанская слава», які праводзіўся Міністэрствам культуры БССР. Ужо былі мемарыялы ў Хатыні і Брэсцкай крэпасці, таму Пятру Міронавічу Машэраву як былому партызану вельмі хацелася мецца масштабны мемарыял народным мсціўцам. Месца меркавалася ў маладзечанскім накірунку каля Ратамкі. Адзначу, што помнік так і не быў створаны. Ды гэта ўжо справы грамадскія, цяпер нават гістарычныя, а тут паперадзе літаратурныя. Старонку ў «Літаратуры і мастацтве» (праўда, ілюстрацый было больш, чым тэкста) абсалютна можна лічыць першай публікацыяй, бо газета літаратурная, рэспубліканская, ды і тэкст можна разглядаць не як водгук ці рэцэнзію, а як эсэістычную імпрэсію на тэму мемарыяльных праектаў. Адно што падпісаў зноў жа два, праўда, цяпер мой першы, не па алфавіце: «У. Мароз, М. Дзятко, архітэктары». Навошта я цягнуў Мікалая ў суаўтары — па інэрцыі ці каб весялей было? Скажам проста — выдаткі маладосці...

> **Далей усё залежала толькі ад цябе, гэта я разумеў правільна. Як разумеў адразу, што літаратура – справа мужных, бо пытанне "А каму гэта ўсё трэба?" паўстае, на жаль, часта, і не кожны здольны правільна на яго адказаць**

Невялічкая вытрымка аб адным з праектаў:

«...На далейшым шляху рэзкім кантрастам з папярэднім паўстае кампазіцыя «Рэха вайны» — аскепкі бомбаў і снарадаў, якія ўрэзаліся ў жытнёвае поле. Гэта вобразны напамінак аб пачатку вайны, аб пачатку барацьбы і выпрабаванняў.

Далей з невялікай уваходнай плошчы пачынаецца «дарога ў партызаны», якая ідзе па гаці праз балота, праз лес. Сцяжынкі, як ручайкі ў русла ракі, сцякаюцца ў адзіны шлях — шлях народнай барацьбы...»

Тэкст і сёння цікава прачытаць, бо і сам ён, і праекты, аб якіх вядзецца, ёсць дакладным і праўдзівым адбіткам часу. У іншым праекце пасярэдзіне пантэона гарыць касцёр на магіле невядомага партызана(!). А то як жа — магіла невядомага салдата каля крамлёўскай сцяны ёсць, то няхай у нас у Беларусі будзе магіла невядомага партызана! Чым мы горшыя? Пампезна, але ж і патрыятычна як з беларускага гледжання.

Прыемна было надрукавацца ў рэспубліканскім літаратурным выданні. «ЛіМ» я ведаў са школьных гадоў, бо бацька мой, Вікенцій Іванавіч, выпісваў гэтую газету, як і «Звязду», з самага пачатку свайго настаўніцтва. Так што я быў дасведчаным у беларускім літаратурным жыцці, чытаў шмат беларускіх кніг. Вабіў гэты свет, адным словам. І чамусьці я ўяўляў сябе паэтам. Магчыма, проста таму, што прыгожа — паэт. Праўда, спробы ў вершаскладанні ў школьныя гады і ў студэнцкія нейкага канкрэтнага плёну не давалі, праблемы былі не са словам, а з рытмам. Але ж архітэктура — таксама найперш рытм! Вось і прарэзалася. Вершы пайшлі на апошнім курсе, якраз падчас працы над дыпломным праектам. Якраз тады акром празаічнай мовы праявілася і паэтычная, што стала галоўным штуршком для паступлення ў Літаратурны інстытут праз два гады пасля політэхнічнага.

Натуральна, паўстала пытанне паэтычных публікацый. Я б і не спяшаўся (увогуле, заўсёды вельмі доўга збіраюся), але тут мой Вікенцій Іванавіч падціснуў, каб я даў вершы ў раёнку. Газета мела найменне «Кастрычнік». І вось тут, на літаратурнай старонцы «Узлёт» пад рубрыкай «Дэбюты» 24 чэрвеня 1978 года былі надрукаваныя два мае вершы «Папяровыя гарады» і «Патрэбныя словы».

Трэцяя «першая публікацыя» ў Івацэвіцкай раённай газеце «Касрычнік» сапраўды першая як чыста літаратурная з біяграфічнай логікі пісьменніка. Але ж я на той час ужо лічыў сябе сталічным хлопцам — каму пахваліўся публікацыяй у раёнцы? Таму карцела надрукавацца ў сталічным выданні. Гэта здарылася ў «Маладосці», дзе загадчыкам аддзела паэзіі быў Пятрусь Макаль. У той «маладосцеўскай» нізцы ў нумары 4 за 1981 год было чатыры вершы — зноў жа «Папяровыя гарады» (мая візітоўка як пачаткоўца), «Верш пра даўгі», «Аэрапорт» і «...Закруціла. Работы многа». Не сорамна мне за тыя вершы і сёння, і я вельмі ўдзячны за публікацыю светлай памяці Петрусю Міхайлавічу Макалю, а ўскосна і Сяргею Зуёнку, які тады быў галоўным рэдактарам часопіса.

Гэтая чацвёртая «першая публікацыя» ў «Маладосці» была калектыўнай, на старонцы сем фотаздымкаў маладых людзей. Зразумела, мне хацелася, каб вершы былі надрукаваны асобна, але гэта было не ў маёй волі. Як і тое, што першая кніжка сталася таксама калектыўнай («брацкая магіла», як жартавалі пачаткоўцы). Тады, напэўна, меў і крыўды крыху, бо сам адчуваеш сябе сапраўдным паэтам, а людзям пры поглядзе збоку так яшчэ не здаецца...

Зборнік вершаў у серыі «Першая кніга паэта» называўся хораша — «Крыло». Выйшла кніга ў «Мастацкай літаратуры» ў 1984 годзе і складалася з васямнаццаці (!) аўтараў. З іх шмат хто застаўся стала ў літаратуры: Мікола Шабовіч, Алесь Усеня, Уладзімір Сцяпан, Анатоль Зэкаў, Васіль Сахарчук (светлая яму памяць), Яўген Гучок, Алег Бембель.

Мая нізка ў зборніку «Крыло» мела назву «Пяшчотны дотык». Вершаў даволі — цэлы аркуш, па ліку дваццаць дзевяць. Фотаздымак рабіў адмыслова — папрасіў калегу па Дзяржкіно БССР узяць фотаапарат, выйшлі ў стары горад (на маю вуліцу Інтэрнацыянальную) ды зрабілі фотасесію, як сказалі б цяпер. Праўда, у кнізе старога горада як фона не відаць, толькі мой твар з позіркам, скіраваным наперад...

У тым жа 1984 годзе адбылася пятая "першая публікацыя", калі мець на ўвазе адметнасць і своеасаблівасць гэтага выдання, у зборніку "Дзень паэзіі/84", – вершы "Ідылічны матыў" і "...Ветрык. Сонца. Парку цішыня", якому пазней я даў назву "Прадчуванне восені". Зазначу, што выданне "Дзень паэзіі" мне вельмі падабалася, харошая была прыдумка. Друкаваўся там амаль кожны год, зборнік выходзіў яшчэ дзесяць гадоў да свайго скагнання.

Заканчэнне ў 1983 годзе Літаратурнага інстытута, зборнік "Крыло" і публікацыя ў "Дні паэзіі" ў 1984-м, ужо літаратурная праца старшым рэдактарам Дзяржкіно БССР падводзілі своеасаблівы пачаткоўскі падрахунак. Далей усё залежала толькі ад цябе, гэта я разумеў правільна. Як разумеў адразу, што літаратура – справа мужных, бо пытанне "А каму гэта ўсё трэба?" паўстае, на жаль, часта, і не кожны здольны правільна на яго адказаць.

11 чэрвеня Уладзімір Вікенцьевіч Мароз адзначыў сваё 65-годдзе. Шчыра віншуем нашага паважанага аўтара і жадаем яму новых «першых» публікацый!

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 6 (142) | 29 чэрвеня 2018 | № 24 (587) Новы час

Маё Шчонава



Альжбета КЕДА

Не адпускае мяне маё Шчонава. Кнігу «Шчонаўскія абразкі» напісала, выдала. А ўсё блукаю па тых сцежках-дарожках, даўно зарослых, занядбаных. Прыходзяць у мае мроі шчонаўцы, якія даўно ці нядаўна на высокім грудзе спачын знайшлі. Згадваецца нешта яшчэ, каб укласціся ў новую вязанку «Шчонаўскіх абразкоў»...

Каханне ўсяго жыцця

Мо падумае хто: гэтая раманная назва — ды пра Шчонава, пра ягоных людзей, што ўсё жыццё толькі і рабілі, што выжывалі, працавалі. Так! Гэтая назва пасуе. Бо той шчонавец і сапраўды ўсё жыццё кахаў яе, прыгажуню Маню Дубеняву, што ў Дуброву за Бэха замуж пайшла. Шлюб узяў з іншаю, шматдзетным бацькам стаў, гаспадаром не абы-якім — ганаровым, паважаным. А душа ягоная ўсё жыццё да яе, далёкай, не яму аддадзенай, хілілася. Пачуццё сваё хаваў, ніколі і нікому не выказваў. І ёй, каханай, прызнаўся толькі перад смерцю яе ранняю. Усё расказаў: як пакутаваў, як не пасмеў прызнацца, як штораз, ведаючы, што яна дзе-небудзь быць павінна, ішоў у надзеі хоць здалёку ўгледзець. Быццам на споведзі, усё ёй расказаў. А праз колькі дзён яе не стала.

Прыйшоў дахаты ўчарнелы, як хмара. Да жонкі:

— Сталін памёр...

Тая не адказала нічога. Ведала, хто памёр...

Сталіну заставалася жыць яшчэ пяць гадоў.

Той, хто кахаў Маню ўсё жыццё, вядомы ўсім шчонаўцам Уладзімір Таўлуй, Валадзенька.

Першая ахвяра вайны ў Шчонаве

Ёю стаў малады савецкі салдат. Расстраляны сваімі.

Савецкія войскі адступалі. Ішлі групамі, па адным. У таго салдаціка быў харошы конь. Відаць, не аднаму гаспадару ў вока ўпаў. Падпаілі хлопца, спірту поўна было, з Варончы пананосілі, з бровару. Заехаў ён у хату да Сенніка, там яшчэ дабавіў. Пацягнула няшчаснага на любошчы. Пачаў заляцацца да Ліды Сідаравай, рэвальверам пагражаў. Настаўнік Лесэк, што там апынуўся, раззброіў. А тут якраз іншыя салдаты падышлі, і камандзір між іх. Кінуўся да яго Сідар:

— Я батрак, усё жыццё на паноў рабіў, а ён маю дачку згвалціць хацеў!..

Толькі кіўнуў той начальнік, схапілі салдаціка, рукі назад закруцілі. Уладак Лысы заступіцца хацеў, прасіць таго камандзіра стаў:

— Таварыш, не страляйце яго! Ён жа такі маладзенькі...

— Алі дзе ж там — звярына! — гэта ўжо дачка Уладкава цётка Фаня Лысішына, якая ўсё гэта памятае, каментуе тыя падзеі.

Застрэлілі салдаціка, у грудзі куля трапіла. Кінулі каля капцоў у Мокраве і пайшлі далей. Пахавалі яго батракі там жа, каля капцоў...

Уладак забраў паперы, што ў кішэні гімнасцёркі знайшоў. Прастрэленыя, у крыві. Дакументы там былі, здымкі маці, сястры, лісты ад іх. Спачатку хацеў адаслаць родным, паведаміць, што загінуў хлопец. Але пасля перадумаў. Спаліў усё.

— Ні буду пісаць, ні буду адсылаць. Хай маці ні ведая, хай чакая, — так вырашыў...

Цётка Фаня і сёння з болем згадвае тыя падзеі, са шкадаваннем:

— Шкода хлопца, такога маладога загубілі. Алі ж і сам вінаваты: нашто напіўсё? Нашто да Ліды лез? Ды яшчэ з пісталетам. Гарэлка вінаватая...

Не мог загінуць!..

Траім маладым кабетам, амаль аднагодкам, што мужоў на фронт у 1944-ым годзе выправілі, праз некалькі месяцаў загадалі ў ваенкамат з'явіцца. З'явіліся. А ім пахаронкі ўручаюць. І тканіну на сукенкі. Шоўк. Дзве ўзялі. А трэцяя,Таня Чычукова, дачка Мікалая Абэлгі, адмовілася:

— Не вазьму. Жывы мой муж! Не мог ён загінуць: сын у яго!

Пахаронку дахаты прынесла: загінуў ва Усходняй Прусіі. І нумар магілы пазначаны.

А праз тыдзень прыйшоў ад мужа ліст, зноў пайшла ў ваенкамат праўду шукаць. Сказалі, што памылка выйшла, жывы яе Мікалай, паранены толькі, у шпіталі ляжаў. І ваенком за тое, што яна так верыла, прапанаваў тканіны болей, чым тым іншым, удовам, далі. Але адмовілася ганаровая Таня Чычукова ад «болей» і ўзяла столькі, колькі ўсім давалі.

Адзіная з тых траіх, што мужа з вайны дачакалася.

Рубель

Вялікія грошы ў пачатку 1960-ых гадоў. Пенсія ўсяго дванаццаць была. А бохан хлеба дванаццаць капеек.

Вось жа, дала мама адной малой шчонаўцы цэлы рубель. Бо дробных грошай якраз у хаце не было, а ў райчанскую краму халву прывезлі. Няблізкі свет. Ісці адной не вельмі файна. Сказала дзяўчынкам суседскім, што ў Райцу збіраецца. І рублём пахвалілася. Тыя з ёю падра́дзіліся.

Толькі калі ў ядлавец увайшлі, зразумела малая, чаму правесці яе ўзяліся: накінуліся выжлы, быццам крукі, рубель той забраць хацелі. Але так моцна трымала малая свой скарб у сціснутым кулачку, што як ні стараліся, як ні расцісkалі пальчыкі, вырваць грошы не змаглі. Мёртваю хваткаю трымала.

Кінулі яе «сяброўкі», дахаты вярнуліся. Ды дзяўчынка ў Райцу ўсё ж такі трапіла...

А рубель, вярнуўшыся, маме аддала, бо пакуль да крамы дайшла, халву разабралі.

Не ўпільнавала

Яблыкі. Белы наліў. Раннія, налітыя, смачныя-смачныя. Мала ў каго ў Шчонаве добра радзілі. А дзяцей, падлеткаў, моладзі ў кожнай хаце поўна было. Усім яблыкаў хочацца. А сваіх няма. Таму не праміналі магчымасці чужымі паласавацца, у сад убіцца. Не лічылася гэта за страшны грэх.

Вось жа, у Ліды Абэлгавай якраз і ўрадзіла тым летам яблыня. Вельмі не хацела гаспадыня свае смачныя яблыкі страціць. Вырашыла вартаваць. На вуліцы стаяў стары жалезны ложак. Прылегла на яго. І заснула. Зразумела ж, стомленая была страшэнна, бо цалюткі дзень у цяжкай працы, ні прылегчы, ні прысесці. Адна, без мужыка, траіх дзяцей падымала.

Маладыя хутаранскія жартаўнікі Валодзя Пэкар і Валодзя Аляксандраў вырашылі правучыць кабету. Занеслі яны яе разам з ложкам у Зямчатку і пакінулі ў бродзе.

Прачнулася Ліда, а вакол яе вада цячэ. Спалохалася, закрычала. Зразумець не можа: што ж гэта робіцца, дзе яна?!..

Многае дзівіць у гэтай гісторыі. Гэта ж трэба, што прыдумалі? А дужыя якія! Праўда, напрасткі ложак з Лідай неслі, праз раўкі. Але ўсё роўна з кіламетар будзе. А сон які ў жанчыны моцны! Не праснуцца, калі на ложку нясуць.

Не ўпільнавала Ліда свой белы наліў...

Чычук багаты

Не ўзлюбіла Кацярына Барывана свайго райцаўскага зяця Аркадзя Чычука. Яе Зіна такая харошая, вачэй не адвесці. А Чычук брыдкі, губаты. А тут яшчэ жыць на пачатку разам давялося. Сыйдуць маладыя на працу, а цёшча ўсё бубніць на зяця, злосць наўздагон зганяе. Малая ўнучка Таіса слухае ды дзівіцца сама сабе: «Што гэта бабуля ўсё шэпча: Чычук багаты, Чычук багаты?..» Ды так ёй засмакавала тое незразумелае багаты (так слова малеча перайначыла), што ходзіць яна па вуліцы, і ўсё паўтарае:

— Чычук багаты, Чычук багаты...

Вечарам бацькі з працы вярнуліся, за сталом усе, вячэраюць. А малая і тут выдае сваё:

— Чычук багаты.

Застылі ўсе, зяць чырванню наліўся. Малая зыркае і зноў заводзіць:

— Чычук багаты...

Павярнуўся да яе бацька ды — лясь па губах. Зайшлася Таіса ў плачы. Бабуля суцяшаць кінулася, на зяця наракаць:

— Во бачыш які ты, зяцёк!.. Як гэто можно — малоё па губіць біць?..


А дачка да яе:

— Гэто ж табе, мамо, па зубах трэба было даць...

Дзеці настаўніцы

У Шчонаве не было садка. Ніколі. За ўсю немалую гісторыю вёскі. Як гадавалiся дзеткі? Глядзела мама, дапамагалі бабулі.

— А што яна робіць? Нічога: з дзіцём сядзіць, — так казалі



пра самую вялікую працу, якую спаўняе жанчына ў сваім жыцці: нараджае і гадуе дзяцей. Калі яны пачыналі хадзіць, то ўжо былі дарослымі. Іх можна было выпусціць у адных кашульках летам на вуліцу: хай гуляюць. Сядзела старая бабуля, наглядала. І гэтага было дастаткова.

А ў шчонаўскай настаўніцы, якая мусіла праз два месяцы быць на працы, не было блізка мамы, што магла б дапамагаць, глядзець дзетак. Гадавала няня. А дзеці пагодачкі. Калі падраслі, ім было па тры-чатыры, чатыры-пяць гадоў, яны ўжо давалі рады сабе самі і летам няблага спраўляліся, а нават ужо ў нечым дапамагалі маме. А зімой, калі мароз, холад, калі пакідаць іх адных у хаце не магла і выпусціць адных, каб яны хадзілі па марозе, баялася, брала дзяцей у школу. Яны прыходзілі, як усе вучні, і рабілі тое, што ўсе дзеці. Пісалі, чыталі, малявалі. Не памятаюць нават, калі чытаць навучыліся. Як да школы хадзіць пачалі. Недзе пасля чатырох гадоў.

Аднойчы ў школу завітаў інспектар. Зрэшты, яны завітвалі неадноўчы. Былі частымі гасцямі. Тым разам нейкі незнаёмы мужчына, здалёку, не з раёну. Настаўніца хуценька паклікала сваіх дзяцей. Апранае ім палітончыкі, дзяўчынцы завязвае хустку, хлопчыку апранае шапку. У калідор выходзіць інспектар і пытаецца:

— Што гэта Вы робіце? Куды Вы іх збіраеце, зараз жа пачынаецца ўрок?

Настаўніца бянтэжыцца. Яна апускае вочы долу і кажа:

— Гэта мае дзеці.

Яна разумее, што парушае працоўную дысцыпліну.

— І куды Вы іх адпраўляеце?

— На вуліцу, хай ідуць гуляюць.

— І што, ваша сэрца будзе спакойным, калі дзеці будуць адны хадзіць па марозе? Няхай ідуць у клас.

Яна толькі ціха прамовіла:

— Дзякуй...

Інспектар сядае побач з дзяўчынкай. Назірае за ёю, як піша, чытае. Настаўніца не выклікае сваіх дзяцей, не звяртаецца да іх. Як заўсёды. Дзеці здаюць сшыткі, і яны таксама. Іх сшыткаў яна не правярае. Яны ўжо не маюць на тое надзеі. Калісьці крыўдзіліся, а цяпер разумеюць: у мамы столькі працы, што іх сшыткі яшчэ пачакаюць. Іх сапраўднае школьнае жыццё яшчэ наперадзе. Але робяць усё па-сапраўднаму.

Апошні ўрок маляванне. Вучні малююць пейзаж. Маляваць прыроду — улюбёны занятак дзяўчынкі, якая вельмі любіць кветкі. Кветкі зімою не растуць, таму яна малюе лес, дрэвы, засыпаныя снегам. Ёй вельмі хочацца намаляваць зайчыка пад елкай, а зайчыкаў маляваць яна не ўмее. Пачынае маляваць нешта падобнае больш на ката, чым на зайчыка. Інспектар уважліва глядзіць на яе малюнак. Яна бянтэжыцца, атрымоўваецца яшчэ горш. І тады ён бярэ яе алавічок і дамалёўвае зайчыка, які атрымоўваецца бы жывы. Дзяўчынка радуецца.

Яна не ведае, што гаварыў інспектар настаўніцы. Дзеці ідуць дахаты, каб чакаць маму. Інспектар праводзіць разгляд урокаў. Маму заўсёды хвалілі. Яна была старраннай, добрай настаўніцай. Дзеці шчонаўцы і сёння памятаюць яе. Давала добрыя веды. Яе выпускі ў Райцы вылучаліся між выпускаў з Дубровы, Плужынаў.

Вечарам маці расказвае бацьку пра візіт інспектара, пра тое, як ён захапляўся ведамі яе малых дзяцей. Асабліва здольнасцю дзяўчынкі маляваць. Сказаў, што яна можа быць мастачкай. Дачцэ гаворыць тое, што гаварыла неадночы:

— Ніякай мастачкай ты не будзеш. Хто цябе будзе вучыць?.. Але ён цябе пахваліў.

Яе дачка мастачкай не стала...

Неба прыйшло на зямлю...



Васіль ЗУЁНАК



* * *

Заспявалася,
Як згадалася,
Адгукнулася,
Як пачулася,
А змаўчалася...
Як падумалася.

* * *

Выбар вялікі,
А пэўнасць адна, —
Тут не разлікам
Шана і цана,

Тут сэрцу мерак
Не дадзена знаць:
Богу — верыць,
Жанчыну — кахаць!..

Прышэсце

Сонечнай радасці крэскі
Весняць крыло матылю,
Сведчаць на ўзлеску пралескі:
Неба прыйшло на зямлю!..

* * *

Даўно такога не было:
Пад яблыняй — сумёты.
З пялёсткаў снегу намяло,
А вулей спеліць соты.

Даўно пчаліную гурму
Так не шчадрыла квецень:
Абвеснiў мёдную зіму
Рой — і сабе, і дзецям.

Наваселле

Купіў лесавік — і танна! —
У чэрвеня новы дом:
Без сцен, без вакон — паляна —
Дыхае цёплым святлом.

Начлежны світанак

Белы конь, як белы туман
Пад чырвонаю грывай зары,
І ў кашах сунічных палян
Лета выспеленыя дары.

З імі ў згодзе й прасмолены бор:
Коціць водар на паплавы.
Дагарае начлежны касцёр,
Уступаючы сонцу правы.

Старога парка жыхары

У атачэнні ліп і клёнаў,
Пад іх наглядам векавым
Дрэў маладых квітнеюць кроны,
На завязь песцячы правы.

Ланіты раніцы абвеяў
Галінкай яблыневай сад,
Як у руцэ паненкі веер
Пад сонцам трыста год назад.

І тым, хто сёння маладзее,
І тым, з вякамі на кары, —
Усім вясну пароўну дзеляць
Старога парка жыхары...

Настальгічны матыў

Валі

«Купіце фіялкі!
Купіце фіялкі!» —
Спяваў патэфон.
А ў памяці даўкай,
А ў памяці даўкай
Той голас, як сон.

Заела пласцінку,
Заела пласцінку, —
Збіваецца круг.
А голас — націнкай,
А голас — націнкай:
Амаль што заглух...

Ды сонечным раннем —
Як выклік паданням —
На Лысай гары
З-пад рук тваіх дбайных
Зляцела з гайданнем
Сто кропель зары.

Як неба прыветнік,
Размаіўся кветнік:
Цюльпаны цвітуць!
Праз вёсны і леты
З пласцінкі тандэтнай
Той голас нясуць.

«Купіце фіялкі!..»
А сонечны ранак
Ідзе нагадаць:
Не ўсё адспявана —
Квітнеюць цюльпаны, —
Навошта купляць!..

* * *

А мне ўжо «энны» дзясятак, —
І гэта не трыццаць тры!.. —
А ўсё малады, незаняты
Гняздуецца чорт унутры.

І носіць вясновыя ласкі
Асенняя золь у душу,
І лета само, без падказкі,
Прыходзіць, хоць я не прашу.

Аднак, не спяшайце лякацца,
Старэчых не тузайце сноў:
Віноўніца ўсіх правакацый
Адна і нязменная — зноў!..

Такі ўжо ў яе характар,–
А я — пра яе, пра яе:
Гэта паэзія раптам
Завалу гадоў узарве.

І што з ёй рабіць? «Глуповатой»
Сам Пушкін яе ахрысціў...
А мне ўсё ж «энны» дзясятак...–
Паэзія, адпусці...

Надпіс на кнізе «пісьмы з гэтага свету. 1995»

Лістоў лянотна не пісаў —
Разборак і паклонаў сумесь,
Паціху рыфмы выкрасаў —
І тым трымаў са светам сувязь.

З канвертаванай мітуснёй
Паштовых не ганяў кур'ераў.
Не-не, я не лічыў хлуснёй
Лісты, ды болей вершу верыў.

З начнымі думамі яго
Я адпраўляў да адрасатаў —
І да сяброў, і да багоў,
І перад кім быў вінаваты...

Цяпер шкадую: што ж, стары,
Век звекаваў, лічы, сам-насам,
І для архіва не стварыў
Эпісталярнага запасу.

І толькі верш, бяссонніц брат,
Зрэдзьчас ці кпіць, ці суцяшае:
«Як апраўдацца нам? Наўрад
Скажу, бо й сам таго не знаю...»

Перад вечнасцю

Пакуль жыву, пакуль жывыя вы,
Ва ўсіх у нас адсутныя правы,
Ва ўсіх у нас падсудныя хвіліны:
Душу спытае вечнасць за правіны.

Зямное і нябеснае

З часам раблюся ўсё больш зямны:
Слухаю не сілы касмічныя,–
Хіба мацней, хто скажа, яны
За сілу зямную?
Не вечнасцю час адлічваю,
Ды касмічна шчырую:
Дзве-тры вечнасці —
І не меней —
За адно зямное імгненне
Космасу ахвярую.

А на зямлі раблюся ўсё больш нябесны,–
На зямлі — цесна.
Слухаю не ўдары сарака саракоў
У адлікі славы пудовыя.
Не шукаю скрынку цвікоў,
Каб будаваць палацы лядовыя.

Ні найдзюкоў,
Ні кансерватараў,
Ні бальшавікоў,
Ні завадатараў,
Ні тылавікоў,
Ні ліквідатараў-
Сілавікоў... —

Усе і ўсё —
Нібы камень на дно.

А са мной
На арбіце зямной
Застаецца адно:

Слухаю ўдары сэрца свайго
Маленькага, —
О, не знаць бы, што ўсё гэта ў ім
сабранае! —
І нябеснае, і зямное... —
Колькі ў ім усяго-ўсявенькага...
А яно ўсё ідзе —
Не з жабрацкай кавенькаю,
На сардэчнасць не абабранае,
Не засіленае маною,
Ідзе —
Не трымціць па-рабску каленькамі
Перад уладнаю брамаю,
Ідзе —
У саюзе са мною.

Веру, сэрца, табе —
Ты знаеш:
Колькі ў мары маёй магіл,
Столькі згублена светам дарог...
Ты — зямны мой бог
І малітва мая зямная, —
Я ўсё табою напоўню,
Дзе разрывае вечнасць кругі,
І на шляху крыжавым,
Зноў і зноў я табе напомню
Пра зямныя мае даўгі:
Іх цяжар не пакінь жывым.

Дыялог

Жыццё:
— А мне ўжо — ці круць, ці верць —
Ісці пад тваё крыло.
І што б ты рабіла, смерць,
Калі б жыцця не было?

Смерць:
— Запомні: я адбіццё
Тваё ў зваротным канверце.
І ці было б жыццё,
Каб раптам не стала смерці?..

Сучасныя

Да багоў днём і ноччу
Абіваюць парогі:
На зямлі быць не хочуць,
А ў нябёсах — не могуць...

Ахова

Купіла жаба купіну
Ў самотнага вужа.
А тое, што ўжо куплена,
Пазначыла мяжа.

Ахова на валоданне
Бусліная прыйшла,
І жаба ўзнагародаю
На снеданне была...

Закурвае д'ябал...

Народ даканала «чарка і скварка»:
Співаюцца людзі;
Палітыкаў корміць ідэйная сварка:
Платформаў студзень;
Натхняе творцаў надзея-махлярка:
Дух у аблудзе;
Аскетаў знявервае догма-святарка:
Бог бога судзіць...

Закурвае д'ябал пацехі цыгарку:
Весела будзе!..

Нацюрморты майго



Вольга РОПАТ

Белы кубачак з бутаньеркай (летні эцюд)

У кожнага ёсць «свае» рэчы. З кожным дотыкам яны пачынаюць дыхаць. Жыць.

І ў мяне таксама ёсць «свае» рэчы. «Ранішнія», «вячэрнія»... «восеньскія», «летнія»...

Шторанак — у кожнага з нас новы настрой. Ад чаго ён залежыць — невядома. Ад надвор'я, ад сну... Не ведаю. Часцей за ўсё мы, як ледзь ажыўленыя скульптуры з адчуваннем адзіноты, смутку, наліваем у свой кубачак гарачае пітво. Мой белы кубачак апёкся. Ён дыхае ўсё часцей, часцей... Шэранькі дымок пачынае танчыць. Фу— уууу... Фу— уууу. Гэтай восенню я чамусьці палюбіла какаву. Цёплае, па— свойму мяккае...

Самае цікавае: па кубачку можна здагадацца, каму ён належыць. Падкажа не толькі памер і малюнак, але і след вуснаў... Пасля дзяўчынак застаецца непрыкметная сарамлівая ружовая плямка, пасля жанчын — бардовыя ці колеру морквы ўпэўненыя адценні. Кубак — прадмет гасцінны. Ён рады ўсім, хто напоўніць яго цяплом і «растопіць» халодны абадок.

Пустэча адзіноты яго запаўняе,
Квадратная лямпа лашчыць святлом.
Кубачак белы ранак чакае,
Чакае... Хто будзе з ім за сталом?

Ранішнія праменьчыкі лашчаць акенца. Праз паўпразрыстыя кветкі на цюлі яны прасочваюцца ў кватэру, быццам хочуць з'яднацца з маім сонным сілуэтам. Прыемныя ранішнія імгненні, калі жанчына з цёплай, ледзь бачнай, патаемнай усмешкай адчувае абдымкі юных праменняў.

Белы кубачак з бутаньеркай чакае мяне, чакае маіх абдымкаў. Ранішнія праменьчыкі ўжо аблізнулі светлы абадок. Яшчэ ўвечары паставіла кубачак насупраць акенца, каб вэлюм святла пакінуў след пачуццёвых пацалункаў — блік.

Раніцу першага дня лета вырашыла зрабіць мятнай, духмянай, жаўтавата-зялёнай. Кубачак здзіўлены — танчыць цень, стаіўся рэфлекс, самаўпэўнена паглядае блік. Ён адвык ад прыемнага, зеленаватага напаўнення. Гэта мой падарунак. Насыпала лісцікаў мяты. Лісточкі, як тэатральныя актрысы, напудраныя, са сціплым водарам парфумы.

Праз акно падзьмуў лёгкі, ледзь чутны халадок: цюль засаромеўся (адышоў убок). Ажывіўся шэры з адценнем блакіту рэфлекс на белым кубку, і я адчула ў гэтае імгненне, што адбылася патаемная размова.

Кубачак ажывіўся. Наліла кіпень — ускочылі, быццам папрыгунчыкі, лісточкі. Здаецца, зялёныя багіні спрабуюць датыкнуцца да абадка. Лыжкай— чарапашкай «утапіла» іх жаданні. Зеленаваты цыліндр аддае спакойны водар — непаслухмяны, звілісты дымок павольна лунае ў паветры кватэры. Ад мятнай вадкасці кубачак з ружовымі кветкамі расслабіўся. Томнае, знясіленае лісце мяты ляжыць на дне, аддаўшы свой колер і водар кавалеру з ружовай бутаньеркай.

Ранішнія прытарныя праменьчыкі, быццам набрыняўшы лімонным сокам, настойліва прасочваюцца скрозь дзіркі на цюлі, — святло і цень адхапілі сабе месца на шурпатай сцяне. Прыпякае. Белы кубачак з ружовымі кветкамі таемна слухае жоўта-зялёны водар...

Сяджу за сталом каля акна — трэба напісаць матэрыял. Дваццаць трэцяя раніца вясны выдалася вохрыста-блакітнай: жоўта-арэхавы пясок мяжуецца з травой бутэлечнага колеру (здалёк здаецца, што гэта балоцістыя мясціны), голыя таліі дрэў. Яны старанна цягнуцца не да схаванага ў пярыне аблокаў сонца, а да металічнай шэрай нагі-ліхтара, каб перарасці «ненатуральнае» святло. Рабрыстыя аблокі навісаюць над дахамі; чым далей ад мяне, тым яны ўсё святлей. Паглядаю на неба, і здаецца, што яно шурпатае, як акварэльная папера. На ўзроўні маіх вачэй працягнулася далікатна-блакітнае крыло анёла. Вось дзе пачынаецца ўсё светлае і прыемнае.

Але я не пішу. Сяджу і паглядаю на неба, як малое дзіця. Жоўтае люстэрка ў выглядзе сонца адвярнулася ад мяне — пазірае ў акно, быццам зазывае мінскае бляклае сонца. А мой белы кубачак з ружовымі кветкамі не зводзіць з мяне свайго пагляду і напаўняе пакой пахам зялёнай мяты. Адвярнулася ад аблокаў і зірнула на кубачак: гэта не гарбата з зёлкамі, гэта бледна-фісташкавы паўпразрысты цыліндр спакою. У ім уверх і ўніз — скача распраўленае лісце. Узяла лыжку-чарапашку, зрабіла тры кругавыя рухі — і лісце зноў тан-

Беспрынцыповы



Таццяна КАРЫТКА

— І не сорамна табе?

— У сэнсе... сорамна? Я, мабыць, ідэйны. Ці я не плакаў, калі глядзеў «Плошчу»?

— Так, плакальшчыкаў у гэтай краіне хапае і без тваёй хітрай морды.

— Вось гэтых несправядлівых абвінавачванняў не трэба! Ну, пісаў па- расейску, размаўляў таксама, дык мяне ў школе толькі таму і навучылі! Гэта вы тут у Менску такія, прасветленыя. А ў нас, у Магілёве, гэта было не ў трэндзе. Атрымаў бы пару разоў па мордзе, і не стала б вялікага пісьменніка. Каму б ад таго лепей было?

— Вялікі пісьменнік не прадаецца за трыццаць срэбранікаў.

— Яшчэ як прадаецца! Нечага тут гарадзіць вакол асобы пісьменніка нейкія хлусlівыя агароды! Ён перш за ўсё правадыр мастацтва, а мастацтва маральным не бывае; за гэтым, калі ласка, да каментатараў у Інстаграме, там усе высокамаральныя ды вечна абураныя чужой разбэшчанасцю.

— А, чорт з табой! Тады хаця б слоўнік купі.

— У мяне ёсць адзін.

— На дзесяць тысяч слоў?

— Мне больш і не трэба. Вунь музыкі на сямі нотах сімфоніі пішуць, хіба я горш?

Тым не менш, слоўнік на ўсялякі выпадак Косця купіў. Ліха яго ведае, можа, спатрэбіцца дзеля натхнення.

Усё пачалося з Яны (сам Косця да такога жаху не дадумаўся б), калі тая вырашыла выдаваць часопіс для таленавітай, сумленнай моладзі. Само сабою, на беларускай мове (на рускай хай там у сваёй Расеі выдаюць). І стукнула Яне ў галаву, што Косця ў гэтым часопісе павінен весці калонку. Нібыта Сара Джэсіка Паркер, хіба што горад паменш. Калонка, як прынята, ні пра што, нейкая балбатня «за жыццё», з якой Косця справіцца, як ніхто іншы, ці дарма ў дыпломе напісана, што філосаф. Вось хай і філасофствуе.

Зразумела, на беларускай мове.

Косця спачатку адмовіўся.

— Ну які з мяне беларус! Я толькі ў чатырнаццаць гадоў сюды пераехаў, я да гэтага года слова «Часопіс» чытаў з націскам на апошні склад, у мяне нават і беларускага пашпарта няма!

— Гэта ўсё глупства! — адмахвалася Яна. — Дзяўчат беларускіх любіш?

— Вядома, люблю, — зніякавеў Косця.

— Значыць, і па-беларуску загаворыш! Тут галоўнае — практыка. Ніякай рускай мовы з гэтага часу. Гавары, пішы, чытай, выключна па-беларуску. Праз два тыдні чакаю ад цябе першы артыкул.

Усе будуць маўчаць, і толькі потым, недзе там, у сваім куточку, падзеляцца вядомым позіркам ці іранічным шэптам. Хочаце верце, хочаце не, Бог выгнаў людзей з Раю, калі яны пачалі іранізаваць»

Косця і рады быў адмовіцца, але ж у той час знаходзіўся на вяршыні магчымасцяў свайго чарговага кахання. З такім запалам можна і ў космас на веніку паляцець, не тое, што там нешта па-беларуску накалякаць.

— І апошняе, — дадала Яна, развітваючыся. — Часопіс будзе з невялікім ухілам у фемінізм. Не палохайся, ад цябе ніякіх асаблівых тэм не патрабуецца, пішы, што хочаш, але... ну быццам ад імя жанчыны.

І Яна шматспадзеўна пацалавала яго ў вусны.

Дзённік Косці Арлова *(заведзены ў тым самым сшытку, дзе ён спачатку канспектаваў К'еркегора, пасля адпрацоўваў розныя шрыфты на семінары па каліграфіі, пасля пісаў вершы, а ўсе палі якога, тым часам, абпісаны бездухоўнымі «хлеба, макароны, пластыр»)*

Паставіў беларускую раскладку (і куды яны дзелі «у нескладовае», а вось!), абклаўся Караткевічам, як бабуля абразамі. Самому смешна. Які ты пісьменнік, калі ўчора хвілін на дзесяць заліп на слова «разбэшчаны». І так яго круціў, і гэтак; якое ўдалае слова, ці не напісаць пад яго апавяданне? Сорамна толькі будзе перад нашчадкамі, яны ж пазнаходзяць потым такія другія ці трэція сэнсы, што вочы на лоб палезуць. А разбэшчаны, скажуць, было лішняе. Лепш было б сказаць — «юрлівыя». Ага, калі б аўтар на той момант ведаў такое слова.

Наступны сказ павінен быў пачацца са слова «Забавно», але, глядзі ж ты, няма ў руска-беларускім слоўніку такога слова. Можа, дрэнны слоўнік, ці, можа, беларусам не бывае «забавно», а ўсё больш балюча ды прыкра, не ведаю.

Дарэчы, праблема. Як можна сур'ёзна пісаць апавяданне, калі кожнае слова разглядаеш як цацку? Вось гэта, думаеш, гучнае, цікавае, падобнае на французскі аналаг, а другое — не, нейкая сялянская лексіка, а я ж хацеў гучаць па-сучаснаму? І пакуль гэтыя думкі туды-сюды бегаюць, накрылася мядніцай сюжэтная лінія. Ну добра. Не за дзень Вільня станавілася. Нездарма ж купіў слоўнік, га?

03.01.2018

— Ну што, напісаў? — спыталася Яна ў дамафон.

— Так, адчыняй хутчэй!

Шчаслівы Косця, пераскокваючы праз прыступкі, узляцеў на трэці, дзе ўрачыста перадаў Яне букет і флэшку. З парога палез цалавацца, нават паспеў запусціць рукі пад блузку, але Яна незадаволена адхілілася.

— Спачатку справа.

— Ну... справа, дык справа, — расчаравана ўздыхнуў Косця і папёрся ўслед за Янай. У наступны раз будзе выбіраць менш апантаных дзяўчын.

Артыкул Першы. Цяжка не зайздросціць экстравертам

«Калі і былі ў дзяцінстве нейкія ўрокі, на якіх вучылі, як завязваць лёгкія, добразычлівыя адносіны з іншымі людзьмі, то я іх паспяхова прапусціла. Магчыма, хварэла. Шкада, бо без гэтых ведаў уладкавацца ў сучасным свеце цяжка. Тым больш, па натуры я хутчэй экстраверт, і ў нейкім сэнсе нават цягнуся да людзей, але раблю гэта так нязграбна ці няўмела, што сустракаю ў адказ адны напружаныя, насцярожаныя позіркі. Мабыць, нешта ў маёй манеры выдае, што я з іншай пясочніцы, але дзе яна, мая? Дзе водзяцца такія ж адшчапенцы, што і я? І ці спадабаюцца яны мне навогул? Ці не пагляджуся я ў іх, як у люстэрка, з думкамі «Ну і дзівакі?»

Давайце ўжо прызнаемся разам: з людзьмі цяжка. Асабліва — з добра выхаванымі. Паспрабуйце па позірку, па секунднай змене ў твары, па непрыкметна наморшчаным носе зразумець, што яны падумалі насамрэч. Нярэдка, да крыўднага нярэдка, вось так ляпнеш што-небудзь, і чуеш у адказ няспрытную, ці нават абураную цішыню. І думаеш: ды што не так?! Не, вы скажыце, мы абмяркуем. Але ніхто не скажа. Усе будуць маўчаць, і толькі потым, недзе там, у сваім куточку, падзеляцца вядомым позіркам ці іранічным шэптам. Хочаце верце, хочаце не, Бог выгнаў людзей з Раю, калі яны пачалі іранізаваць».

Тут Яна спыніла чытанне.

— Так, гэта ўсё, вядома, добра, але нецікава... Засне твой чытач над такім артыкулам. Трэба дадаць агню, гневу, ну ці мне цябе вучыць! Напрыклад, напішы што-небудзь пра маці.

— І да чаго тут будзе маці?

— О, гэта ўжо няважна! Пра маці ў цябе заўсёды выходзіць добра, шчыра, шчымліва. У кожнага ёсць маці, кожны зразумее. А вось гэтыя дэпрэсіўныя соплі нікога не хвалююць.

— Яны хвалююць мяне.

— Тады пачытай Карнэгі! Схадзі да псіхатэрапеўта. Ды і я ўпэўнена, што яно табе насамрэч не трэба. Прыдумаў сабе вобраз незразумелага паэта і носішся з ім, як дурань з торбай.

Косця абыякава пацісnуў плячыма. Трэба табе маці — калі ласка.

Артыкул Першы. Цяжка не зайздросціць экстравертам.

(Працяг, звязаны з папярэднімі думкамі выключна жаданнем хутчэй перайсці да рамантычный часткі спаткання)

ЖЫЦЦЯ

чыць (а можа, карагодзіць, — хто ведае?) вакол белых сцен, потым мякка апускаецца да насычанага донца. Люблю свой кубачак за тое, што ў ім ажываюць пахучыя зёлкі. Яму ўтульна тут, каля мяне. Калі стаўлю яго ў шафу з іншымі кубкамі і зачыняю навясную драўляную скрынку, ён пачынае сарамліва глытаць цёмнае паветра. Сцены ціснуць на яго, ён адчувае пустэчу і адзіноту…

Мой белы кубачак ненавідзіць празрысты кубак за тое, што ён не мае колеру. Ледзі Ніхто. А што, калі гэтая празрыстасць толькі пачынае жыць? Можа, яна чакае, каб яе напоўнілі? Мой герой абыходзіць кубак з надпісам «Cappuccino». Надпіс ёсць, а «напаўнення» няма. Мой белы кубачак раўнуе мяне да астатніх…

Жоўтае адлюстраванне

У кожнага з нас ёсць свае рэчы— сябры. Мы так прывыклі да іх, што іншы раз ужо не звяртаем увагі на тое, што менавіта яны ніколі не перасяляюцца ў іншыя куткі нашай кватэры. Новы прадмет — як кватарант: трапіў у новы асяродак… не ўтульна яму. Вось і пераходзіць з месца на месца. А нашыя родныя рэчы заўсёды побач, мы іх нідзе не забываем…

Вось і са мной заўсёды пераязджае жоўтае люстэрка на тонкай бялявай ножцы. Мне яго падарылі яшчэ ў родным Мазыры на дзень народзінаў, а цяпер яно пазірае ў акно на мінскую светлую вуліцу. Кожную раніцу яго жоўценькі ў выглядзе кветкі абадок аблізвае, лашчыць востры сонечны прамень. А люстэрка з вечара рыхтуецца да сустрэчы: выпростваецца і падстаўляе круглы тварык. Мабыць, рэпетуе. Люстэрка ўжо немаладое, згінаецца час ад часу, ад чаго яго твар часта апускаецца ўніз. А мне шкада. Мы столькі разоў пераязджалі… і я ніколі не забывала яго, не шукала замену.

А цяпер 7:22. Люстэрка атаграецца пасля халоднай ночы, ловіць праз цюль з кветкамі і жоўта-малочную штору сонечны свет. Ранішняе святло цёплае… Яно яшчэ чыстае, не кранутае. Гэта як першае каханне. Раніцай люстэрка заўсёды вельмі прыгожае; здаецца, быццам бы кожны дзень нанова гатовае закахацца ў маладое сонечнае святло… А ўдзень ужо бавіць час са мною. Калі ў яго няма настрою (звычайна гэта восенню і зімою) ці яно не хоча мяне бачыць (пакрыўдзілася) — твар вісіць. Люстэрка ў мяне капрызлівае, з характарам. Да яго патрэбен асаблівы падыход. Я некалькі хвілін яго супакойваю і стараюся падняць настрой.

Жоўты свет — белы блік
На круглым люстэрку.
Ён прыціх. Светлы твар
Паглядае праз цюль.
Раніца. Першы абдымак…
Жнівень.
Святло.

Малочная прыгажуня

Гэтая ваза малочная… Як быццам майстар, калі рабіў яе, у апошні момант вырашыў дадаць лыжачку мёду, але не такога яскравага, аранжава-карычневага, зацукраванага, а прыемнага: жаўтавата-малочнага, мёду, які яшчэ не выкупаўся ў промнях пяшчотнага ранішняга сонца, яшчэ не паспеў насыціцца — пажаўцець.

Але за той час, пакуль я яе разглядала, яна зрабілася для мяне роднай. Яна ціха стаіць на сваім месцы, пасярэдзіне століка, як гаспадыня, бо назірае за іншымі рэчамі ў кватэры. Ваза адразу мне спадабалася. Бывае, думаю, што засталася тут, у гэтай кватэры, таму, што закахалася ў яе. У гэтыя жаночыя, плаўныя, абцякальныя формы, невялічкі памер і колер, які зрэдзьчас нагадвае мне родны дом, мой цёплы Мазыр і пухнатыя, духмяныя булкі з карыцаю з крамы «Каравай».

Ваза мне здаецца заўсёды вясёлай і стрыманай. У сонечны дзень яна зліваецца са святлом, пляскімі круглымі «зайчыкамі» ад люстэрка, у шэравата-празрысты дзень — выглядае як радасная, прыгожая постаць, зацікаўленая ў маім настроі. Яна таксама штосьці думае, адчувае… Але што?

Яе плаўныя выгіны нагадваюць мне добрую, спакойную жанчыну ў сукенцы з кветкамі і салодкімі мядовымі, аліўкавымі ўзорамі. Светлую, з доўгімі валасамі, блакітнымі вачыма, у якіх блішчыць маленькая, ледзь бачная слязінка. Ад радасці, мабыць. Даўгія блікі толькі падкрэсліваюць яе жаночы стан, тонкую талію…

Сёння ваза назірала за мною. Калі ўбачыла, што пішу пра яе — узрадвалася, падміргнула мне (штосьці хуткае праляцела за акном і на паўсекунды адлюстравалася ў вазе). Ваза падказала, які водар ахутвае яе. Цёплы ванільны, пах свежых булак і малака. Ён нагадвае яе дзяцінства. Гэта пяшчотнае, здаецца, летняе і «цёплае» адценне водару.

Каб не было ёй сумна, пазнаёміла з травамі— дзяўчаткамі, якія штодзень апускаюць тварыкі, каб сказаць ёй некалькі прыемных слоў. Бывае, яны гуляюць з вазай: дакранаюцца сваімі пухнатымі косамі да яе шыі… Ім весела. І мне ад гэтага радасна.

Стаіць адзінокая ваза,
Глядзіць яна ў акно…
Плаўныя формы здзіўляюць,
У водары смачным яны
Прападаюць…


Фота www.ubscribe.ru

«У дарослым жыцці часцяком не хапае ванны.

Памятаю, калі была маленькай зубрылкай з жыдзенькім хвосцікам валасоў на патыліцы, ніяк не магла выправіць шасцёрку па біялогіі. Шасцёрка ў маёй маці за адзнаку не лічылася. Шасцёрка была першай прыкметай майго хуткага падзення ў галечу і невядомасць. І вось, пасля чарговага беспаспяховага перапісвання нейкага тэста, я прыцягнулася дамоў, з панурым разуменнем, што дома нічога добрага мяне не чакае.

— Ну што? — запыталася маці з кухні.

Я ў той час ціхенька стаяла ў калідоры і здымала боты. Маўчала. А што гаварыць? Усё, што вы скажаце, будзе скарыстана супраць вас.

Не дачакаўшыся адказу, маці выглянула з кухні.

— Выправіла? — зноў запыталася маці, хаця нявыпраўленная адзнака ўжо завісла над маёй галавой і чырванела адтуль сваёй бязлітаснай кругласцю.

Не памятаю, што дакладна я адказала, але памятаю, што нешта зусім няправільнае. Мабыць, што не люблю біялогію. Мабыць, нават некалькі разоў гэта паўтарыла: не люблю, не люблю! Мабыць, што мне пляваць на гэту адзнаку, хай будзе і шасцёрка, што мне з таго?

Памятаю, як маці крычала. Крычала нешта традыцыйнае, звычайнае, што я проста лянуюся, што не будзе ў мяне ніякага Менску, бо куды я са сваім шасцёрачным атэстатам, што як кніжкі чытаць — на гэта часу хапае; ну нешта такое, што ведае кожны шкаляр. І вось выплюхнуўшы ўсё гэта, маці сыйшла на кухню, а я так і засталася стаяць у калідоры без ботаў, але ў зашпіленным на ўсе гузікі паліто. І так мне прыкра і балюча стала: бо я ж так старалася, зубрыла гэтыя віды і падвіды, але тэст быў цяжкі, з тых, дзе па некалькі варыянтаў адказаў правільныя (чорт бы пабраў такія тэсты), што я, як была, у паліто, зайшла ў прыбіральню, забралася ў бліскуча белую ванну і заплюшчыла вочы. І на нейкі кароткі момант жыццё спынілася. Мне падалося, што больш нічога не будзе, зусім нічога: я так і буду ляжаць у гэтай ванне, дзесьці далёка маці будзе лямантаваць, настаўніца біялогіі — здзекавацца, але мяне, мяне ўжо не будзе, я на векі вечныя захавалася ў гэтай ванне і больш не падымуся.

Праз некалькі хвілін да мяне зазірнула маці. Падаецца, здзівілася, але не тое, каб моцна.

— Падымайся, — сказала яна і зачыніла дзверы.

Я і паднялася, я заўсёды была паслухмяным дзіцем. Дыхаць стала неяк лягчэй.

Але дзе ў дарослым жыцці набыць гэтыя ванныя, каб класціся туды кожны раз, калі захочаш, каб свет хоць на трохі перастаў існаваць?»

— Ну во, гэта лепш, — пахваліла Яна.

Косця быў няўпэўнены.

— Ведаеш, не хацелася, каб думалі, што я зусім завіс у гэтых дзіцячых успамінах. Што я сваё няўдалае жыццё апраўдваю складаным дзяцінствам. Бо, на самай справе, у мяне было добрае дзяцінства. І маці пра мяне заўсёды клапацілася, можа, больш, чым патрэбна, але клапацілася.

— Ой, ды хто пра цябе будзе думаць, гора ты маё! Галоўнае, што пра ванначку — гэта пікантна, з прыбабахам. Адразу паказвае, які ты нетыповы, цікавы. Звычайных людзей нам не трэба. Пра звычайных ужо зашмат напісалі ў дваццатым стагоддзі. Лепш скажы, ты наступную тэму выбраў?

— А як жа, — адказаў Косця, нацягваючы штаны. — Наступная будзе — каханне.

Артыкул другі. Цяжка быць Казановай

«Ладна, не тое, каб цяжка. Хутчэй — няёмка. Асабліва перад сабой. Асабліва, калі гэта здараецца ў тысячны раз, і ты ўжо ведаеш усе свае рэакцыі і паслядоўнасць пацуццяў, і мозг табе крычыць: «Назад, куды лезеш, няўжо не сорамна?!». А сорамна заўсёды потым. Спачатку заўсёды прыемна.

Не, сур’ёзна, хацелася б быць іншай. Такой, хто кажа «назаўсёды», а не падлічвае, наколькі хопіць гэтага «назаўсёды»: на гэты год ці толькі да наступнай пятніцы?

Такой, ведаеце, Кацюшай, якая зберажэ каханне, пакуль там хтосьці зямлю родную беражэ.

Кацюша ўнутры мяне нічога не хоча берагчы. Кацюша жадае феерыі пачуццяў і калейдаскопа эмоцый, новых твараў, новых пахаў, новых прызнанняў і новых дасягненняў.

Кацюша хоча гуляцца. Ёй бы падпісваць напачатку дамову: «Мы з табой несур’ёзна». Бо сур’ёзна ёй нельга, у яе ёсць галава на плячах, ім ніколі не быць разам: яна транжыра, ён эканом, у яе ўсе сукенкі развешаны па колеру, у яго ўсе швэдары — на крэслах. Не, дакладна нельга. Але ж вось так, на паўжартах, чаму не? Пакуль пячэ ў сэрцы ад яго позіркаў, ад яго ўсмешак?

Ды толькі дамовы ляжаць пакінутыя, непадпісаныя, а людзі ўжо гуляюць сур’ёзна. Цяжка такіх сустракаць пасля расстання.

Адны пакрыўджаныя праз мяне на весь свет.

— Я праз цябе страціў давер да ўсіх жанчын! Я цяпер пусты. І мне лёгка.

А я пра сябе думаю: паглядзі на мяне, я ж маленькая. Ці варта на мяне такое вешаць? Ці ёсць тут мая віна?

Другія, наадварот, пазабывалі на ўсе крыўды і сустракаюць са шчанячай радасцю.

— Ведаеш, гэта знак! Як у той дзень, калі мы пазнаёміліся. Толькі тады першы снег пайшоў, а цяпер — жнівень…

Ад гэтых яшчэ больш агідна. Дурны-дурны, няма ніякіх знакаў. Можа і ёсць адзіны ва ўсім знак, што свет з цябе здзекваецца».

Дзённік Косці Арлова (сшытак той самы, але Косця нейкі іншы)

Ну вось, зноў не тое. Зусім не пра тое хацелася распавесці. Дарэчы, у Маэма ёсць знакамітая цытата (Божа, можна хаця б яе не перакладаць, няма ніякіх сіл на гэтую мову!): «We are like people living in a country whose language they know so little that, with all manner of beautiful and profound things to say, they are condemned to the banalities of the conversation manual. Their brain is seething with ideas, and they can only tell you that the umbrella of the gardener’s aunt is in the house.»

Вось я такі чалавек. Столькі ўсяго роіцца, мітусіцца на сэрцы, у галаве, столькі ўсяго хочацца выліць, як брудную ваду з карыта, на чытача (няўдалае параўнанне, але як мог, так і параўнаў), а на выхадзе, на паперы, у электронным файле, — адны мёртвыя словы, роўныя, прылізаныя, нягздольныя нікога не абразіць, не зачапіць.

Гэй, чытач, ты як там, ці адчуваеш мой боль, маю пяшчоту? Ці разумееш? Я ж тут спецыяльна для цябе распрануўся, і голы, з непрыгожай, сіняй скурай, стаю на марозе, затуляючы рукамі пахвіну, і гэта ўсё дзеля таго, каб ты заўважыў, спыніўся, каб сэрца тваё захлынулася нечым, чым захлынаецца маё.

Не адварочвайся ад мяне, не ігнаруй. Так, я кепскі пісьменнік, кепскі жанглёр словамі, але я навучуся, я калісьці здаў біялогію, што мне гэта гульня з паперкамі! Толькі дзе ўжо гэты чытач? Бяжыць на апошні тралейбус, адказвае на сто сорак сёмае на сёння паведамленне, гартае навінавую стужку. Ён заняты, яму патрэбна сачыць за ўсім светам, а са мной яму ўжо усё зразумела. Ён ужо недзе такое чытаў. І, падаецца, там было сказана лепш.

— Косця, ты куды знік? Дзе артыкул? Дзе ты сам, урэшце?

— Яночка, ты прости. Нужно помочь одной знакомой: тоже, представляешь, решила выпускать журнал. Говорит, на белорусском писать снова немодно, эти белорусы со своим пробуждением самосознания уже и так всё заполонили, надо дать дорогу русскоязычным!

— Якая знаёмая?! Што ў цябе з ёю?

— Исключительно, исключительно рабочие отношения, Яночка! Журнал у неё с лёгким уклоном в ЛГБТ. Буду вести колонку от имени гомосексуалиста. Будет интересно. Я тебе как-нибудь принесу номер.

Дарогі, дзе я не хадзіў



Валеры ДУБОЎСКІ

***

Этнаграма беларуса
анясмелена
сіпласцю нацыі.

Час ламае яе
праз нас.

***

Жэст прыроды
даўжынёй
у тваё дыханне.
Жыццё.

Жэст прыроды
даўжынёй у бясконцасць.
Сусвет.

Жэсты быцця.

***

Зімы хачу.
Каб дух мароз прадзёр.
Каб першы снег
Бясконцасць растлумачыў.
З табой у снезе я
Крылаты і гарачы.
І не пазёр —
Нябёсны фантазёр.

Там, пад аблокамі,
Дзе краявід — амбон,
Да слоў тваіх
Дадасца замірэння.
Душа твая
Палёт маёй пярэйме —
З палону восені
У снежаньскі палон.

***

Зачытаўся табою,
як кнігай настольнай,
восень.
Глядзь — а не восень ужо,
а снежань.
Насміхацца ўмее
бяда нястомна —
снежань,
а я без адзежын.

Нікім нявы-
кляты,
а такі надрыў.
Побач — ні варагаў,
ні дарадцаў.
Ды што б там хто
ні гаварыў —
ніякай ахвоты
халадам здавацца.

***

Падгледжанае шчасце
не сагрэе.

Падслуханая мудрасць
не ўразуміць.

***

Шкло нечакання працёр.
Мяцеліца.
Ты.
Пачуццё.

***

Я ахвярую часам
Час ахвяруе мной.

***

Памяць не рызыкуе.

Рызыкуе
Наступства.

***

Адсунься ад поўні
на адлегласць
нявыпітай жарсці.
Бліжэй да мяне.

***

Небанальнае
адчуванне банальнага
і ёсць паэзія.

***

Пазыкі знакаў.
Пратэсты жэстаў.
Праз цэлы свет
Душа твая жывая.
І ўсясвет мімволі абуджае,
І стаўшы знакам,
Устае пратэстам.


***


Імжа.
Закрасніла.
Іржа
на ціх-ставочку.
З'яўленне восені.
Знікненне ў адзіночку.

Як рух смаўжа.
Як тло лаўжа.

***

Сляды.
Запарушыла
Неслухмяным снегам.
Сівая вершаліна
Маўчыць паган-
скім слэнгам.





Ты йдзеш сюды.
Я йду туды.
Ці сыйдуцца
Сляды ў адны?

***

З летуценняў,
з трывог дарогі,
з імкнення, смагі, знямогі.
І пераступаў парогі,
у кроў паразбіўшы ногі.

Дзяды
і бацька з матуляй
праз Неба мяне адчулі.
Прыйшлі да мяне
адкуль вы, —
дарогай адной,
перакуленай?

Дарогі,
дзе я не хадзіў,
і тыя, дзе наслядзіў,
выбіраў зусім не адзін —
наступцам-унукам
наўздзіў.

***

Не тое...
Не пра гэта...
Не пра тых...

Не хочацца
Ні гаварыць,
Ні слухаць...

Неабыякі і збавенны слых...

Да восені я
Прыкладаю вуха...

***

Лужок кашу
І знакі шлю каўшу.
Таму, што ў небе,
Ля Палярнай Зоркі.

Дазволу —
З конаўкі дапіць прашу
Зямнота кону смак
Саладкавата-горкі.

Вось на лужку расклаў
Свае зямныя знакі:
Пачуцці, словы
І сыноў і ўнукаў.
І дождж — няхай,
Саладкавата-мяккі.
І гром — няхай,
Што мне
Маўчаў і грукаў.

***

Брукам іду
ці па рытвінах,
Аблокі лаўлю,
аднакрылы вятрак...
Яшчэ напружыцца —
і магчыма, вытрываю.
Напружваюся — і
нешта не так.

Уздымаюцца
ў роспачы грудзі.
Не адбалела,
баліць крыло.
Даруй за тое,
чаго не было,
і за тое,
чаго
ніколі
не будзе...

***

«Гэта проста быў вецер», —
падумалася
цёплым вечарам
ля рэчкі,
у цэнтры горада.

І падняў голаў я,
зірнуў у здагадцы
туды,
наўздагон нечаму.

«Гэта проста быў вецер», —
падумае нехта
пасля,
праз дні і ночы,
праз гады і вуліцы,
праз пытанні і неадказы.

А гэта ляцела
мая душа.

***

Гадую
дванаццаць дубоў:
быць,
думаць,
тварыць,

жадаць,
любіць,
нараджаць,

ведаць,
верыць,
вучыць,

бараніць,
даравaць,
помніць.

Узрастаючы, мізарнею.
І выбіраю.

З дванаццаці адзінаццаць,
з адзінаццаці дзесяцёх,
з дзесяцёх дзевяць,
з дзевяцёх восем,
з васьмёх сем,
з сямёх шэсць,
з шасцёх пяць,
з пяцёх чатыры,
з чатырох тры,
з трох два,
з двух адзін.

Які?..

***

Маё старое драпавае
паліто
даўно зраслося
са мной.
Стала мной.
Увасабленнем мары:
бадзяцца па свеце,
па шклоўскіх пагорках,
па ашмянскім бруку.
Паліто
гатовае без мяне,
ужо былога,
як сцень-невідзімка,
пайсці самахоць.
Адчуць пах
неспазнанай прасторы.
І маёй самоты.

***

Чэрвень.
Пярэспа.
Вечар.
Пяшчоціць таполевы пух.
Марыць і плакаць
аб нечым
лягчэй, калі вы ўдвух.
Калі
набрынялыя стомай
сэрцы гатовы змаўчаць,
збылое даруй другому,
у прышлым
другому дарадзь.
Калі
незбянтэжана й плыўна
пасля гаваркіх перуноў
пачуццяў таемных
хвіліна
звякуе ў Свіслачы
зноў.

***

Урэшце
мне сэнс вядомы
і слоў,
і далёкіх дымоў.
Думаў —
дарога з дому.
Напраўдзе —
дарога дамоў.

Віншуем Валерыя Леанідавіча ДУБОЎСКАГА з 70-годдзем і зычым яму новых «няходжаных» дарог, здароўя і радасці!

Іншым разам жыццё нечакана высалапляе нам з люстэрка язык. Мы пачынаем абурацца: «Што гэта за пачвара?! Як такое можа здарыцца?! Гэта не мы!» Б'ём у набат, шукаем прычыны ў люстэрку. А трэба ў сабе...



Ёсць вялікі змысел ва ўсім: у замен народу змантаваць маналітную папуляцыю паслухмяных чальцоў. Багата прыродай адораны талентамі спяваць, жартаваць, танчыць, народ уціскваецца ў пракрустава ложа хлуслівай ідэалогіі пры дапамозе падмены Божага дару на «яешню»

Маскульт

Менавіта такім адбіткам успрымаўся многімі пераможца Еўрабачання 2014 года Канчыта Вурс. Шмат хто палічыў сябе ў той момант пацярпелым: «Як так?! Хтосьці здзекуецца з нашага пачуцця прыгожага! Мы такімі не жадаем быць!» А не-е... То, як раз, самае наша! Гадамі, бы малпы, пераймалі чужыя «ужимки и прыжки», чужыя словы, міміку, жэсты, тэлеперадачы, думкі, музыку і лічылі, што класна выглядаем. Разгубіліся, занепакоіліся... Што ж нам цяпер пераймаць?! А глядач Еўрабачання паказаў кукіш усім тым, хто не здолен прыняць сябе. Нездарма той ноччу больш за ўсіх «пацярпелі ад абразы нашы беларускія меламаны», не прысудзілі выдатнаму голасу ні бала. Мы так звыкліся да калькавання, да другаснасці, што не адчуваем сораму за паўсюднае малпаванне. На экранах маладыя журналісты, высока адукаваныя выпускнікі акадэміі, абавязкова распавядаюць навіны, ідучы і махаючы рукамі, як то некалі для сябе прыдумаў расійскі, сапраўды імклівы, журналіст Леанід Парфёнаў. А мне сорамна за нашых выкладчыкаў ВНУ. Няўжо яны не маглі падказаць сваім выхаванцам чагось свежага, калі ўжо не здольныя навучыць самастойна разважаць.

Маскульт — абязножана-абязручаны па слыхавой асацыяцыі і вобразным уяўленні інвалід з кульцёй і абоймай танных бляшаных медалёў-бранзэлак, юбілейных і памятных значкоў, урачыста пачэпленых на сухотных грудзі героя, узамен страчаных ног-рук на полі бою. Маскульт — пярэварацень, вырадак народнай, нацыянальнай культуры, кармушка для шэрасці, «обуреваемой жаждой деятельности», вялікіх арганізатараў і энтузіястаў чужых высілкаў, дзе на аднаго майстра-прафесіянала альбо таленавітага самародка дзесяць верхаводаў-прысмоктышаў, бязглуздых, некампетэнтных, адпаведна не адукаваных самадураў і самадурак, паталагічна амбітных, з маніяй самазначнасці «выходцев из народа»: начальнікаў, здольных стакроць адцурацца папярэдніх лозунгаў, каб, борздзенька падбрыкваючы, гнацца за любымі свежанаквэцанымі і гвалтоўна праз маскульт «внедрять» іх у галовы народа; здольных прыстасавацца і паверыць любой палітычнай канфесіі, калі тая не пагражае стратай пасад і не заяўляе: «Аюсь — ад карыта!» Галоўнае — масавасць, як залог народнай падтрымкі і апірышча.

Ёсць вялікі змысел ва ўсім: у замен народу змантаваць маналітную папуляцыю паслухмяных чальцоў. Багата прыродай адораны талентамі спяваць, жартаваць, танчыць, народ уціскваецца ў пракрустава ложа хлуслівай ідэалогіі пры дапамозе падмены Божага дару на «яешню».

Эксплуатацыя духоўнай каштоўнасці чалавека ва ўгоду Молаху, Ваалу, Асмадэю ды Мамоне перасягнула ў нашым грамадстве ўсе дазволеныя межы. Таму не менш спрыяе індэксаванне ўчэпістых ідэалагем, накшталт: «Искусство принадлежит народу», — нават са слоў свайго куміра ціхенька выціснулі галоўны сэнс «...его лучшей части». Але ў гэтую «лепшую частку» так лоўка ўвінчваюцца прайдзісветы — без асаблівага нюху не разбярэш, дзе «мастак», а дзе мастацтва. Менавіта ад здрады прыспешнікаў калямастацкай, калядухоўнай нівы, а то і сапраўдна адораных дзеячоў культуры, ды не асвечаных промнем сумлення, якія хутка ў пагоні за надзёнымі патрэбамі і палітычнымі лозунгамі забываюць пра абавязак зберагаць вечнае духоўнае, і ствараецца глабальны МАСКУЛЬТ.

Да сямнаццатага стагоддзя агульнанародная духоўнасць праяўлялася праз іканапісцаў, потым на варту заступілі паэты, мастакі, музыканты... Сёння дастаткова цырульніка з мадэльерам

Сваёй увішнасцю гнуткія дзеячы культуры мацуюць дамбу, якая не дае праходу жывой вадзе і сіле чыстага народнага мастацтва.

Кутні камень маскульта — «чарніла», яго пуцяводная рака і зорка. Ці то вёска, ці сталіца: застолле з начальствам — лепшая ўзнагарода, асаблівая традыцыя ў дзень работніка культуры. Яно і магчымасць «патапіць такі-сякі адкат», без яго маскульт ніякай матэр'яльнай карысці для драбнага чыноўніка не нясе. Процівагай усенароднаму дзяржаўнаму крадзяжу, прывітаму ў савецкія гады савецкаму грамадству ўлада выпрацавала яшчэ адну лінію гвалтавання чалавецтва: паўсямесны АДКАТ. Адкат велізарных сродкаў ад будоўлі, медыцыны, аграпрамысловасці, гандлю, навукі, спорту, культуры... Таму цякуць дахі, разбураюцца сцены, ламаюцца машыны, гніюць ураджаі, гінуць людзі... Таму, што народныя сродкі, адпісаныя на дабрабыт краіны, асядаюць у кішэнях злодзеяў-чыноўнікаў любога рангу. Здольныя, таленавітыя прафесіяналы атрымліваюць ганебны жабрацкі «заробак», якога павінна хапіць урэшце на лекі ад усіх праблем — на «чарніла». (Трэба пісаць асобны артыкул, каб раскрыць усе хітрасці роднай бюракратыі: як ашукваць спецыялістаў, не выплочваць ім справядлівы заробак, афармляць яго пад «сумяшчэнне», штучна выдумляць таннейшыя тарыфы...) Як у той час за голыя азадкі, за падстаўленыя сіліконавыя грудзі, паказаныя на ўсю прастору былога Саюза, ахвяруюцца велізарныя сродкі — з мэтай адкату.

Чарніла — звада, прыманка, допінг, узнагарода, суцяшэнне, штучнае панібрацтва — ого-о! — артысты за адным сталом з начальствам, якое назаўтра не гляне і ў той бок; чарніла — кляп у рот, корак у вушы, павязка на вочы, гэта самы ўлюбёны дыпламатычны ход прайдзісветаў. Чарніла (не таннае па кошце) — для справаздач, для хвалебных одаў, чарніла на стол для камісіі і праверак, чарніла пад прыгажэйшай этыкеткай — пад стол начальству, каб лагадней паглядала і не перашкаджала працаваць. Чарніла перад і пасля рэпетыцый, перад і пасля канцэртаў, аглядаў, конкурсаў... Чарніла — мора — пі, народ! Быдлаватыя ад збытку моцы пры кідкім недахопе розуму дзецюкі і дзявулі ў сініх халатах са швабрамі ў руках (калі гэта правінцыя — там заўсёды не хапае сродкаў на сцэнічныя касцюмы) ці вёрткія «вандэрлогі» — абсалютная калька расійскіх «зорак», толькі ў значна больш вартым шкадавання варыянце з відавочна падробнай весялосцю і неспажывальным гумарам, прадукуюць «спушчаны зверху» маскульт. Перадчасна ўсвядоміўшы сябе абранцамі і ўлюбёнцамі «сильных мира сего».

(Звярніце ўвагу на нашу інтэрнацыянальнасць беларускага тэлебачання — каго толькі не ангажавалі ў дыктары і вядучыя: тут і азербайджанцы, і грузіны, і армяне, і габрэі, і цыганы... толькі не беларусы — не дай Бог захочуць на мове загаварыць! Нават дзень беларускай пісьменнасці бессаромна аддыктавалі на замежнай мове. За апошнія гады беларуская мова страціла ў сваёй сіле так, як ніколі не страчвала ні пры адным царскім рэжыме, ні пры адным са сваіх «кесараў». У 1998 годзе выйшла мая першая кніга, яе хутка раскупілі ў раёне колькасцю ў чатырыста асобнікаў. Чытачоў хапала, цікавіліся — калі выйдзе новая кніга? Пакуль змагла выдаць новую, вядома ж, за свае грошы, зусім не стала беларускамоўнага чытача.)

«Культура должна греметь!», «По сто мероприятий в год на каждую кадровую единицу!», «Наши учреждения культуры сэкономили в прошлом году 15% энергозатрат в период отопительного сезона! Обязуемся в текущем году сэкономить 25%». (А ў наступным — абрасці поўсцю, каб не змерзнуць на працоўнай вахце!) Наступны перл трыбуннай красамоўнасці трэба чытаць «чеканя слог и буравя взглядом». «Ког-да бар-ран р-руководит стадом львов — ничего хор-рошего из этого не выйдет! А вот когда л-лев р-руководит стадом бар-ранов — дело идёт на лад!» (не прыдумка... літара ў літару!)

Пры наяўнасці адпаведнага патрабаванням (паслухмянасць вышэйстаячаму) льва, сама сабой паўстае неабходнасць для поўнай камплектацыі падстрыгчы ўвесь статак пад баранаў. Кожны паасобку хоць леў, хоць баран, а ўсё ж — індывідуум з уласнымі прыхільнасцямі, сімпатыямі, густам, а разам, дагаджаючы адно аднаму, каб не парушыць штучна выдабыты хвараблівы панятак субардынацыі, дзе баран губляе мову ад жаху перад ільвом, а самы найгалоўны ЛЕЎ больш за ўсё на свеце, як ні дзіўна, дрыжыць ад страху перад статкам, бо «народ честной — честной он до поры, а коль что не так — опять за топоры! Сколь ни масли ты его, ни ублажай, всё равно для них ты — хан да Мамай...» — ствараюць разам заняпалы шлях, духовае бухалава, няемную баланду, гумовую жуйку — МАСКУЛЬТ.

Апошнія дзесяцігоддзі гэтая з'ява набыла глабальны маштаб. Яна так адпавядае патрабаванням сучаснай постсавецкай сістэмы, так прыйшлася даспадобы ўладам па вертыкалі і гарызанталі, і не толькі бязмежнай магчымасцю адмываць бабкі, баксы, маны, лавэ, — мегасродкі плывуць у пашчу маскульта, які цяпер выпрастаўся зусім у іншую плынь — ШОУ, магчымасцю пад выбухі салютаў і выкрунтасы голых дзяўчат кіраваць да шызу шчаслівымі масамі пры дапамозе сучасных псіхатронных сродкаў; то пагражае паглынуць цяжка напрацаваныя вякамі здабыткі духоўнага развіцця грамадства. (Класічнае мастацтва патрабуе душэўнай працы, а ў нас няма за што бібліятэкам набыць новую літаратуру, акрамя «рэкамендаванай прынудзілаўкі», няма за што купіць у музычную школу самы танны інструмент...) Сіліконавыя цёткі пад шашлычок і грыль, пад папсу і «гапату» разбэшчваюць моладзь «шэдэўрамі маскульта»: «Баунти, баунти, баунти ... уяунти! Сникерсы, сникерсы, сникерсы ...уикерсы!»

Да сямнаццатага стагоддзя агульнанародная духоўнасць праяўлялася праз іканапісцаў, потым на варту заступілі паэты, мастакі, музыканты... Сёння дастаткова цырульніка з мадэльерам. Прыкінутыя адпаведна геі і лесбіянкі, альбо робленыя пад іх, — натуралы не ў модзе, грабуць бабкі, адабраныя ў народа, каб той забыўся назаўсёды пра свае таленты. Густ, душу знішчае дзяржавай дазволеная «духоўнасць». Дарэчы, нашыя беларускія мадэльеры запыталіся ў сусветна вядомых, як ім выйсці на высокі ўзровень, каб у свеце пра іх загаварылі. Адказ узрадаваў!!! «Калі вы жадаеце сказаць штосьці сваё... перш за ўсё станьце сабой! Цікаўцеся сваімі каранямі, сваёй гісторыяй, сваёй культурай... Толькі тады вамі зацікавяцца іншыя».

Дадам — і мовай, яна ёсць скарбніца ўсяго імі пералічанага.

Людміла Андзілеўка

Беларуская Адысея

Беластоцкія вершы Андрэя Чэмера



Фота Сяргея Чыгрына

Аляксей Анішчык у сваёй віленскай кватэры, 2002 г.

Пад псеўданімам Андрэй Чэмер на старонках беларускага друку выступаў мемуарыст, педагог, журналіст і грамадскі дзеяч з Вільні Аляксей Анішчык (1912–2007).

Складаны лёс быў у гэтага чалавека, хаця пражыў ён шмат гадоў. Нарадзіўся на хутары Мондзіна на Навагрудчыне непадалёку ад возера Свіцязь. Закончыў Навагрудскую беларускую гімназію, а потым эканамічны факультэт універсітэта ў Познані.

Перад Другой сусветнай вайной Аляксей Анішчык апынуўся ў Варшаве. А калі пачалася вайна, запісаўся ў батальён абароны польскай сталіцы, за што быў пазней узнагароджаны медалём.

Пасля капітуляцыі Польшчы вярнуўся на Навагрудчыну выкладчыкам роднай мовы і літаратуры ў школе. А потым пераехаў на Беласточчыну, дзе быў прызначаны дырэктарам школы, некалькі разоў сустракаўся і гутарыў з Хведарам Ільяшэвічам — рэдактарам беластоцкай беларускай газеты «Новая дарога».

У гады вайны Аляксей Анішчык працаваў выкладчыкам настаўніцкай семінарыі ў Навагрудку, удзельнічаў у рабоце Другога усебеларускага кангрэса. Пасля вайны жыў у Кракаве, працаваў у розных выданнях. Але ў 1948 годзе яго арыштоўваюць савецкія спецслужбы і прывозяць у Мінск. Савецкі трыбунал прыгаварыў яго да расстрэлу, аднак смяротнае пакаранне хутка было заменена на 25 гадоў лагераў строгага рэжыму.

На Поўначы Аляксей Анішчык адбыў 14 гадоў і вярнуўся дамоў.

Аднойчы ён напісаў ліст у беларускую беластоцкую газету «Ніва», а праз пэўны час атрымаў адказ з Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ), у якім яго запрасілі на працу ў БГКТ на пасаду кіраўніка аддзела культуры. Такая прапанова Аляксея Анішчыка задаволіла, і ён паехаў у Беласток. Гэта была другая палова 1960-х гадоў.

Аляксей Анішчык стаў працаваць у БГКТ, наладзіў добрыя стасункі з «Нівай», дзе друкаваў уласныя матэрыялы.

У сваёй кнізе «Беларуская адысея» (Вільня, 2005–2006) Аляксей Анішчык прыгадвае: «У «Ніве» друкаваліся даволі часта вершы Баршчэўскага, які мне тады паказаўся ў нейкай меры прэтэнцыёзным і ганарыстым... Самыя шчырыя і нават сардэчныя суадносіны завязаліся ў нас са Шведам і Юзьвюком. Швед быў стопрацэнтна тыповым сынам беларускай вёскі. Стрыманы, сціплы, спагадлівы і працавіты, ён быў да дна душы шчырым і добрым, учынным інтэлігентам (падкрэсліваю гэта слова). Прыроджаны такт і добразычлівасць паглыблялі абаяльнасць гэтага чалавека, а паэтычны талент (у асноўным, дзіцячая тэматыка) як бы стварылі арэол рамантычнасці... Юзьвюк умеў працаваць... Я, наглядаючы за стылем працы Юзьвіка, мімаволі заўважыў штодзённы парадак у яго працы, паперах, прыладах...».

У Беластоку Аляксей Анішчык шчыра пасябраваў з калектывам ансамбля «Лявоніха», які актыўна выступаў з канцэртамі на Беласточчыне. Ансамбль у той час быў вельмі папулярны. Напрыклад, у верасні 1966 года «Лявоніха» дала 500 канцэртаў. А 501-ае выступленне было ў вёсцы Шымкі Беластоцкага павета перад школьнікамі.

Аднойчы, як прыгадвае ў сваёй кнізе «Беларуская адысея»Аляксей Анішчык, яны сядзелі ў памяшканні БГКТ і гутарылі пра жыццё-быццё. Былі там Анішчык, Юзьвюк, Лобач і нейкі Куц, які працаваў у гарадской управе. Лобач сказаў, што абрыдзела тут жыць у гэтым «шалмане і здзеку польскіх шавіністаў». «Едзь-едзь на Беларусь! — сказаў яму Анішчык, — там паспрабуеш чэкісцкай ласкі, дык будзеш ва ўсе лапаткі перціся назад..».

Пасля гэтай гутаркі Анішчыка праз пару дзён выклікаў камендант ваяводскай управы паліцыі і следчы. Ва ўспамінах Аляксей Анішчык прыгадвае: «Спярша камендант запытаў, як даўно я прыехаў (хоць яны ўжо ўсё пра мяне дасканальна ведалі), з якой мэтаю і што думаю далей рабіць. Я коратка адказаў, што жыву ў Польшчы другі год. Польшча мне не чужая — тут канчаў універсітэт, шмат гадоў працаваў і дабравольцам бараніў Варшаву ў часе нямецкай інвазіі... А Беласточчына для мяне амаль родная, бо я працаваў тут дырэктарам школы і маю шмат блізкіх сяброў — так беларусаў, як і палякаў. А калі ўсё пойдзе ладам, то можа зноў пайду працаваць у школу. У часе гэтай размовы другі функцыянер (праўдападобна з польскага УБ, гэта значыць — бяспекі) часта ўмешваўся, задаючы колкія і нават злосныя пытанні і нешта запісваючы. Пратрымалі мяне каля гадзіны і развіталіся. Хутка выявілася, што Куц быў стукачом, настрачыў на мяне данос і перадаў свайму начальству ва УБ. Хутка паліцыя выклікала Юзьвюка і дала яму такую галавамыйку, так запалохала, што ён запрапанаваў мне неадкладна выязджаць з Беластока, хоць яму гэтага вельмі не хацелася. Сітуацыя была яснай: энкавэдысты Беларусі баяцца, што магу расказаць зашмат праўды пра жыццё ў савецкай імперыі...» («Беларуская адысея»).

Хутка Аляксей Анішчык пакінуў Беласток і прыехаў на Віленшчыну ў Эйшышкі. А потым перасяліўся ў Вільню, дзе і пражыў да канца свайго жыцця. Там прымаў актыўны ўдзел у беларускім руху. Ён узначальваў суполку віленскіх беларускіх палітвязняў, быў адным з заснавальнікаў беларускай школы ў Вільні, уваходзіў у склад рэдкалегіі старонкі «Беларус Віленшчыны».

З Аляксеем Анішчыкам я шмат гадоў перапісваўся, захаваліся яго лісты, успаміны, кнігі з аўтографамі. Дарэчы, спадар Аляксей за доўгае жыццё сабраў добрую бібліятэку кніг, калекцыю музычных інструментаў. А яшчэ ён шмат пісаў, пісаў на польскай, рускай і вядома ж на роднай мове. У канцы ХХ стагоддзя адна за адной выходзілі яго кнігі: кніга вершаў на рускай мове «Жизнь живым принадлежит» (1996), вершы і нарысы «За калючым дротам» (1996), «Мондзінская балада» (1996), кнігі артыкулаў і ўспамінаў «Партрэты», «Выбраныя Богам», «Сяргей Хмара» і іншыя.

Але самым каштоўным выданнем Аляксея Анішчыка была і застаецца кніга «Навагрудская беларуская гімназія» (Вільня, 1997) з прадмоваю вялікага беларуса, акадэміка Барыса Кіта. Усе вышэй пералічаныя кнігі спадар Аляксей Анішчык пры жыцці прыслаў з аўтографамі мне. На кнізе «Навагрудская беларуская гімназія» аўтар напісаў: «Паважанаму Сяргею Чыгрыну з самымі шчырымі пажаданнямі поспехаў у яго публіцыстычнай і літаратурнай творчасці. Вільня, 27.02.1999 г. Аўтар Аляксей Анішчык». А на зборніку «За калючым дротам» напісаў: «Паважанаму Сяргею Чыгрыну з найлепшымі пажаданнямі. Аўтар Аляксей Анішчык. Вільня, 27.02.1997 г.». Пішу гэта не дзеля таго, каб пахваліцца аўтографамі Анішчыка, а дзеля таго, што часта перачытваю, пераглядаю ўсе выданні забытага беларускага аўтара.

Звярну ўвагу, што Аляксей Анішчык вельмі шмат сваіх паэтычных радкоў прысвяціў сваім сваякам, сябрам, знаёмым, а таксама вядомым беларусам і тым мясцінам, дзе жыў, працаваў, бываў. У паэтычных зборніках сення згубіліся і тры вершы Аляксея Анішчыка, прысвечаныя Беласточчыне. Яны былі напісаны якраз тады — у 1967–1969 гадах, калі Аляксей Анішчык жыў у Беластоку. Гэта вершы «Беласток», «Белавежа» і верш «Прывітанне», прысвечаны ансамблю БГКТ «Лявоніха».

Прапаную чытачам «Літаратурнай Беларусі» беластоцкія вершы Аляксея Анішчыка (Андрэя Чэмера).

Сяргей Чыгрын

БЕЛАВЕЖА

Андрэй ЧЭМЕР

Беласток

Трывожнае сэрца і пытлівы крок
Ізноў прывялі да цябе, Беласток.
У гомане шумнай людской грамады
Здаецца, я зноў, як калісь, малады.
Таксама цяпер, як даўней, як учора,
Хвалюецца натоўпу шумнае мора.
Іскрацца задорам юначыя вочы,
І сыплецца срэбрам, звініць смех дзявочы.
Касцёлаў і цэркваў гучыць перазвон...
Прыміце ж вы, сведкі вякоў, мой паклон!
Хоць шчыра скажу, што пашаны нямала
Ў мяне і да новых, сучасных кварталаў.
Тут многія пнуцца да хмар этажы
І зверху глядзяць на старыя крыжы...
Тут слухаюць кросен бязлікіх стук часты
Сапраўдныя цуды: Антонюк і Фасты!
Каханне і радасць, смутак і гора
Вядуць нас у парку зялёнае мора —
Ў зацішныя сцежкі, дарожкі, альтаны...
Між імі шумяць, серабрацца фантаны,
А там, за дарогай, імкнуцца далей
Квадраты узорных дыванаў, алей...
Прыпынак тут мае народ усялякі:
Спрадвеку жывуць беларусы, палякі,
Татары, расейцы і жмудзь, ліцьвіны
І нават Славаччыны братнія сыны.
Мне радуе сэрца іх праца і згода
На славу Айчыне, на славу народа.
І радасцю шчырай засціцца зрок,
Каля я гляджу на цябе, Беласток.

1967 г.

Белавежа

Морам зялёным раскінула межы
Магутная пушча вакол Белай вежы,
А побач спрадвеку, праз тысячы год
Прыбоем шумеў беларускі народ.
Любімая, родная маці-зямля!
Твая жыватворная вечная сіла
І нас, і чужынцаў, і зубра-камля
Ў добрыя, цяжкія годы карміла.
Народы, як грозныя хвалі сівыя,
Ўсцяж залівалі твае берагі.
Падзеяў крывавых вятры штурмавыя
Наносілі раны на край дарагі.
І жэрла твае дабрадзейнае цела
Навала чужацкая так, як хацела,
Хоць часам ламала крывавыя зубы
Аб косці-лясы твае, краю мой любы...
Па нетрах зялёных гулялі тэўтоны,
Тапталі і зубраў знішчалі цары...
Татары калісьці, не знаючы стомы,
Палілі пасёлкі, лясы і двары...
Знішчалі чужынцы зялёнае мора,
Дзяўчат паланілі на ганьбу і здзек...
І тысячы мерлі ад цяжкага гора,
Ды выжыў усё ж такі наш чалавек!
Прымі ж мяне, краю пушчанскі, свабодны,
З табою мы шчыра, навекі сябры!
Бо ты для мяне, як заўсёды, быў родны,
Як родныя мне і лясы, і зубры!..
Хай песні пра шчасце спяваюць вяршыні
Магутных, нязлічаных сосен, дубоў,
Хай казкі снуюць беластоцкай дзяўчыне,
Хай сны навяваюць пра шчасце, любоў...
У змроку тваіх пераплеценых кронаў
Турыст для турыста і друг, і зямляк.
Навокал у згодзе і без праклёнаў
У дружбе жывуць беларус і паляк.
Магутная пушча ніколі не згіне,
Зубрам дасць апеку на тысячы год!
Служыць будзе верна народнай Айчыне,
Таксама, як ты, беларускі народ!

Беласток, 1968 г.

Прывітанне

Ансамблю БГКТ «Лявоніха»

У смутку і ў каханні, у шчасці і ў бядзе
«Лявоніха» з бадзёрай песняю ідзе.
Цяпла і смеху, жартаў і ласкі хоць крыху
Мы з радасцю прынясім пад кожную страху.
Вітаюць вас сардэчна між нівал і бяроз
Наш паважаны Крупа і Марыся Мароз!
Адкрытым, шчырым сэрцам і поціскам рукі
Вітаюць вас і Янка, і Люба Блізнюкі!
Няхай жа танцам звонкім усіх нас развяселіць
Наш гарманіст вясёлы — Станіслаў Станкевіч!
Каб радасным і звонкім быў сэрца перастук,
Пацешыць жартам, песняй вас Юрка Гаўрылюк!
Як музыка зайграе, дык ножанькі — стук-стук!
Не ўседзяць, як станцуе вам Оля Андраюк...
Жадаем вам сардэчна, каб сонца шчасця, згоды
І добрага настрою свяціла вам заўсёды!..

Беласток, 1969 г.

Кола існавання: пра новую кнігу Віктара Казько

Віктар Казько штоpазу нібыта заваблівае чытача ў непраходны лясны гушчар сэнсаў, адначасова ствараючы ілюзію знаходжання ў звычайнай сялянскай хаце.

На ўлазіны ў новую хату, як вядома, трэба першага запускаць ката. Аднак новая кніга прозы Віктара Казько «Казань пра ката, каторы смяяўся» (Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў», 2018) — не зусім пра гэта. Кот там сапраўды ёсць, і не проста кот, а адзін з галоўных герояў. Дзіўнаватая мянушка Біч (былы інтэлігентны чалавек) вельмі пасуе людскому атачэнню. Біч ратуе гаспадара ад смерці, наладжвае сувязь з сапраўднымі гаспадарамі зямлі — міфалагічнымі істотамі (Цмокам, Русалкай, Лесавіком, Берагуном, Вохам), спазнае сэнс усяго існага...

Хата як выспа надзеі на выратаванне душы — не па-музейнаму ўладкаваная, з этнаграфічнай ідэалізацыяй традыцыйнага побыту. Але гэта жытло, якое спрабуе пабудаваць сучасны чалавек паводле запаветаў продкаў. Бяда ў тым, што многага з тых справедчых правілаў чалавек сённяшні ўжо не ведае, і, адпаведна, хата будуецца няправільна, грунт пад нагамі — нетрывалы. Бо ўжо даўно пачалося разбурэнне «выпеставанага і запушчанага чалавекам кола яго існавання», якое адмовіла ў існаванні тым тром кітам, на якіх спрадвеку грунтавалася жыццё чалавека на зямлі, — плугу, касе і сякеры.

Унутраныя маналогі галоўнага героя і аўтарскія філасофскія адступленні вельмі падобныя: аўтар і герой прамаўляюць



адначасова, і не заўсёды можна адрозніць іх галасы. Мо таму, што ў творы багата аўтабіяграфічнага. Пісьменнік прымушае галоўнага героя, сталага мужчыну, штораз вяртацца ў далёкае мінулае, на тыя дарогі вайны, крыві і жаху, дзе ён страціў маці і сястру. Для героя, які лічыць сябе Анёлам смерці, бо тыя, што загінулі, «апладзілі працяг яго існавання на гэтым свеце», такая сустрэча — крыніца невылечнага болю.

У прозе Віктара Казько вельмі мала людзей. І калі ёсць такое паняцце як «вера ў чалавека», то ў дачыненні да мастацкай канцэпцыі прозы Віктара Казько ёсць сэнс казаць пра «бязвер'е ў чалавека». Свету прыроды і надчасаваму свету памерлых пісьменнік даверае значна болей: там усё пэўна, там няма здрады.

Касмічнае, тагасветнае, міфічна-неверагоднае цесна пераплятаюцца нават у межах аднаго сказа. З Месяца мы вяртаемся не проста на Зямлю, а ў Беларусь — Пупляндыю (і ўжо не бульбашы, а «пупляндцы», якія «глядзяць сабе пад ногі, моўчкі смаркаюцца ў анучку і часта бегаюць за хлеў»). Пупляндыя — краіна, у якой усе жыццёвыя інтарэсы гуртуюцца вакол «пупа», вакол карыта, месца, якое падаецца дасягненнем раю. «Бязвер'е ў чалавека» нейкім неверагодным чынам спалучаецца з глыбокім спачуваннем гэтым бездапаможным істотам, душы якіх выпальваюцца, бы пякельным агнём, страхам. Чалавек насамрэч сваю бездапаможнасць адчувае. І ўсё, што стварае вакол сябе, увесь гэты лес з прывідных дабротаў і сумнеўных асалодаў — толькі спосаб нават не пазбыцца страху, а хаця б на кароткі час уцячы ад яго.

Нешта ёсць у такім адстароненым аўтарскім успрыманні зразумелай для яго безнадзейнасці будучыні чалавецтва ад разважанняў галоўнага міфалагічнага персанажа — Цмока, які спачуваў чужым пакутам, але ўжо і не хваляваўся за людзей, бо «перахварэў на гэта»: «Адвечная гэтаму зямному люду дарога ў нікуды».

Віктар Казько задае пытанне: «Хто спакусіў чалавека на аднаасобнае валоданне ў гэтым царстве зямным?» Бо ўсё, чалавекам цягам тысячагадовай гісторыі здзейсненае, не дае адказу. Аднак пры гэтым няма маралізатарскага пафасу і пазёрскага стагнання: так, «канчаюць самагубствам азёры, рэкі, рыбы, птушкі і людзі», так, чалавек пазбавіў ужо сябе будучыні на гэтай планеце. Але і планета — часовая знічка ў бязмежным сусвеце, што ўжо пра чалавека разважаць...

Вось толькі каб не гэты пранізлівы боль — такі зямны, такі рэальны, што пульсуе ў грудзях маленькага хлопчыка, асуджанага на вечнае адмаўленне сябе, замест сэрца.

Надзея Раманчык

Алесь Камоцкі. «Не як так»

«Голас барда Алеся Камоцкага хораша пачувае сябе ў міжзор'і ўдзячных сэрцаў. Філосаф па адукацыі, тонкі лірык на паслугах у роднага слова. У век усеагульнай папсы яго песні вяртаюць душу да вытокаў, натуральна гучаць беларускаму вуху, не губляюцца ў сугуччы песняў суседзяў», — гэтыя словы-вітанні Рыгора Барадуліна, датаваныя 2004 і 2012 гадамі, абраныя замест прадмовы, ёмка і дакладна прадстаўляюць аўтара і выканаўцу ўласных песняў, з якім Народны паэт Беларусі сябраваў шмат гадоў.

Сапраўды, усё, напісанае і праспяванае Алесем Камоцкім, аўтарскае або на вершы іншых беларускіх або замежных творцаў, кранае сэрца. У яго новай кнізе выбранай паэзіі «Не як так» (бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў) — найлепшае, што назбіралася ў творчым багажы спадара Алеся, пачынаючы з 1997 года, калі выйшаў яго зборнік «Спроба ісьці па расе», і заканчваючы нізкай 2017 года.

***

Лагодным ліпеньскім дажджом
Вясёлку з неба змыла лета.
Жыццё маё ішло дагэтуль
Не пакідаючы слядоў.
Ішло жыццё маё пакуль
Не разбіраючы дарогі,
Ішло таму, што неслі ногі
Не да таго, хто крокі чуў.
Лагодным ліпеньскім дажджом
Вясёлку з неба змыла лета,
Мне паказаў напрамак вецер,
А я дарогу не знайшоў.

«Не буду шмат прыводзіць цытат на майстэрства і непаўторнасць. Давялося б як не ўсю кнігу прывесці ў прыклад. А што тады чытачу рабіць? Не асмелюся красці ў яго радасць», — Рыгор Барадулін.

Сяргей Шаматульскі. «Они»

Яны — гэта людзі, якіх мы бачым на старых фота або калі стаім у чарзе ў краме, пра якіх чуем у кароткіх застольных размовах. Гісторыі пра іх маленькія і мімалётныя, з-за чаго не атрымліваецца аналізаваць іх дзеянні, рэфлексаваць над правільнасцю-няправільнасцю ўчынкаў. Застаецца толькі спачуваць. Або праходзіць міма.

Сяргей Шаматульскі адразу развеяў надзеі на тое, што людзі з кнігі існуюць у рэчаіснасці, — па словах аўтара, ён не ставіў мэты прысвяціць кнігу камусьці канкрэтнаму.

Ад лёгкага суму першых апавяданняў кнігі, якія закранаюць тэму адзіноты сярод людзей, бліжэй да канца «Яны» даводзяць да ўздрыгу — з'едзены сабака, пахаванне, нябачная прысутнасць Другой сусветнай вайны. Усё гэта яднае старое калектыўнае пастановачнае фота, узятае дызайнерам Юліяй Кандрацюк з архіву Лізы Неўмяржыцкай, якое стварыла, на думку аўтара, «наглядны сінапсіс усяго таго, што хацелася напісаць». З фотаздымкаў на чытача глядзяць безыменныя людзі са стуленымі вуснамі — маўляў, мы сюды не паскардзіцца прыйшлі, а па справе...

Анатацыю рэдактара кнігі Наталлі Паваляевай Сяргея Шаматулскі лічыць самай дакладнай: «Яны — гэта мы». Можа, кніга такая зразумелая чытачу менавіта таму, што ён бачыць у ёй сябе?..

Алена Босава

Адам Глобус. «Казкі сталічныя»

Пісьменніку пашанцавала, і ён змог пажыць і папрацаваць у гэтых цудоўных сталіцах. У дадатку аўтар змясціў казкі пра мастакоў віцебскай школы і неверагодныя гісторы пра іх таленавітыя творы.



Па словах адной чытачкі, гэта «Зборнік кароткіх апавяданняў-казак пра Парыж, Вільню, Мінск і Віцебск (казкі-паданні пра К. Малевіча і не толькі). Звычайнае гарадское жыццё пераплятаецца з містыкай, казкамі: анёлы, вядзьмаркі, пярэваратні, чараўніцтва... Будзе цікава і падлеткам, і дарослым, — кожны знойдзе свой сэнс: філасафічныя па сваёй сутнасці, казкі маюць яркую сюжэтную лінію пра простыя і зразумелыя кожнаму чалавеку рэчы: ежа, хвароба, каханне...»

Кніга выйшла ў серыі «Кнігарня пісьменніка» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў у выдавецтве «Кнігазбор».

Шукайце яе ў мінскіх крамах: «Акадэмкніга», «Цэнтральная», «Светач», «Веды», «Кнігарня пісьменніка», «Кнігі і кніжачкі», а таксама ў буйных кнігарнях ААТ «Белкніга» па ўсёй Беларусі!

Уладзімір Папковіч. «Зазімак: Выбраныя вершы»

Імя Уладзіміра Папковіча, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1981 года, доўгія гады — выкладчыка і загадчыка кафедры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава, перакладчыка з нямецкай і на нямецкую мовы, лаўрэата прэмій «Сузор'е муз» і імя Уладзіміра Караткевіча, добра вядомае чытачам.

Новая кніга паэта прыйдзецца даспадобы аматарам класічнай рыфмаванай традыцыі, сур'ёзнай філасофскай тэматыкі, тонка аздобленай доляй іроніі і самаіроніі лірычнага героя.

Жыццё

Жыццё раствaралася ў шуме і галасе,
Яно зіхацела, трымцела, гуло.
Відовішчам дзіўным яно мне здавалася,
Сачыць за якім так цікава было.
Там людзі смяяліся, пелі, зламаліся,
І слёзы лілі, і на скокі ішлі.
А збоку здавалася, што прыстаўляліся,
Што прытвараліся, а не жылі.
Ды раптам мяне падхапіла няўмольная
Магутная плынь, як паводка вясной,
Кідала, гайдала цяч энне раздольнае,
Гуляла ды забаўлялася мной.
Мне дух захапіла ад нечаканасці,
Я лётаў над хвалямі, падаў на дно.
Глядзеў маладзёнак з ружовай туманнасці
І весела думаў: «Вось гэта кіно!»

У вобразе лірычнага героя, сталага, які азіраецца назад і па-добраму пакепліве з сябе маладога, многія могуць пазнаць сябе. І ў адначассе ў гэтым зборніку шмат прыватнага, шмат асабістага. Нават калі Уладзімір Антонавіч піша пра вёску — а гэтая тэматыка найбольш звыклая і кансерватыўная для беларускай паэзіі, — ён робіць гэта настолькі па-свойму, інтымна, з вышыні свайго жыццёвага досведу, што гэта кранае.

Поруч з адмыслова беларускай прывязанасцю да сваёй зямлі, «укаранёнасцю» ў крэўныя сувязі, свойскасцю можна знайсці ў зборніку і матыў падарожжа. Нездарма



ж архетыповы вечны вандроўнік ужо колькі стагоддзяў вывучае дарогі еўрапейскай літаратуры!

***

Люблю падацца ў белы свет,
У шлях нязнаны і няблізкі,
Купіць да пункта Х білет,
Жыць без нагляду і прапіскі.
Пакінуўшы свой родны дах,
Пакуль душа зноў не заные,
Павандраваць па гарадах,
Дзе ёсць музеі і піўныя.
Худым, счарнелым, з барадой
Вярнуцца і паспавядацца...
Піць роднай мовы сырадой
І ад зласліўцаў адбівацца.

Такім чынам, кніга «Зазімак» выправілася ў белы свет, і спадзяемся, на сваім шляху яна сустрэне нямала ўдзячных чытачоў.

Прэс-служба СБП

Міжнародная прэмія памяці Астрыд Ліндгрэн

На ўрачыстай цырымоніі ў Стакгольмскай філармоніі амерыканскай пісьменніцы Жаклін Вудсан была ўручана міжнародная прэмія памяці Астрыд Ліндгрэн. Узнагароду за дасягненні ў галіне літаратуры для дзяцей і падлеткаў лаўрэат атрымала з рук кронпрынцэсы Вікторыі.



У гэтым годзе прэтэндэнтамі на прэмію сталі 235 дзіцячых пісьменнікаў, ілюстратараў і арганізацый з 60 краін.

Журы прэміі адзначыла, што Ж. Вудсан уганаравана ўзнагародай за асаблівы стыль і мову ў апісанні праблем сучаснай моладзі; аўтар піша «на амаль бязважкай мове» і «дазваляе нам сустрэць маладых людзей, якія з усіх сілаў спрабуюць справіцца са сваёй уразлівасцю і знайсці месца, дзе можна пачаць сваё жыццё». Сябры журы падкрэслілі, што ў сваіх апавяданнях яна ўмее «ўлоўліваць унікальны паэтычны тон у паўсядзённым жыцці, у якім ёсць і смутак, і надзея».

Самымі вядомымі творамі Ж. Вудсан з'яўляюцца «Хлопчыкі цуду» («Miracle's boys», 2000) — аповед пра 22-гадовага юнака, які пасля смерці маці вымушаны клапаціцца за двух братоў-падлеткаў) і «Пёры» («Feathers», 2007) — аповесць, дзеянне якой адбываецца ў 70-я гады ў мястэчку з афраамерыканскім насельніцтвам, куды аднойчы прыязджае белы хлопчык, а таксама аўтабіяграфічны раман «Мары цемнаскурай дзяўчыны» («Brown Girl Dreaming», 2014).

Міжнародную літаратурную прэмію памяці Астрыд Ліндгрэн заснаваў урад Швецыі пасля смерці вядомай пісьменніцы ў студзені 2002 года дзеля садзейнічання развіццю дзіцячай і юнацкай літаратуры. Сума грашовага ўзнагароджання дасягае 5 мільёнаў шведскіх крон (каля 610 тысячаў долараў ЗША). Гэта самая буйная прэмія ў галіне дзіцячай літаратуры.

Букераўская прэмія-2018

Лаўрэатам Міжнароднай Букераўскай прэміі 2018 года стала польская пісьменніца і паэтэса Вольга Такарчук. Цырымонія ўручэння ўзнагароды адбылася ў лонданскім Музеі Вікторыі і Альберта, паведамляецца на сайце прэміі.



Прэмія прысуджаная ёй за раман «Палёты» (Flights), пераклад — Джэніфер Крофт.

Вольга Такарчук — польская пісьменніца, яна нарадзілася ў польскім Сулехуве ў сям'і выхадцаў з Украіны. Вучылася ў Варшаўскім універсітэце. З'яўляецца суарганізатаркай Фестывалю апавяданняў, падчас якога аўтары кароткіх літаратурных формаў з Польшчы і з-за мяжы прадстаўляюць свае творы. З 2008 вядзе заняткі па творчым пісьме ў Апольскім універсітэце.

Спіс фіналістаў «Man Booker International Prize» быў абвешчаны ў красавіку.

Акрамя Вольгі Такарчук, у яго ўвайшлі французжанка Віржыні Дэпэ з раманам «Вернан Субутекс 1» (Vernon Subutex 1), іспанец Антоніо Муньас Малін з творам «Як гаснучы цень» (Like a Fading Shadow), пісьменнік з Ірака Ахмед Саадаві з раманам «Франкенштэйн ў Багдадзе» (Frankenstein in Baghdad), пісьменніца з Паўднёвай Карэі Хан Ган з кнігай «Белая кніга» (The White Book) і венгр Ласла Краснахоркаі з раманам «Свет працягваецца» (The World Goes On).

Памер грашовага ўзнагароджання складае 50 тысяч фунтаў стэрлінгаў. Аўтар і перакладчык кнігі падзеляць іх паміж сабой.

Міжнародная Букераўская прэмія — прыз у галіне літаратуры, заснаваны ў 2004 годзе. Да 2015 года ўручаўся адзін раз у два гады аўтарам, чые кнігі напісаны на англійскай альбо перакладзеныя на англійскую мову, па сукупнасці літаратурных заслуг. З 2016 года прэмію сталі прысуджаць штогод за раман або зборнік апавяданняў, перакладзены на англійскую мову і апублікаваны ў Вялікабрытаніі.

Як паведамлялася раней, юбілей Букераўскай прэміі адзначаць уручэннем «Залатога Букера». Уладальніка прэміі выберуць з папярэдніх лаўрэатаў.

Муракамі — вядучы на Tokyo FM

Японскія СМІ паведамілі, што з 5 жніўня вядомы пісьменнік Харукі Муракамі стане вядучым аўтарскай музычнай праграмы RUN & SONGS на радыёстанцыі Tokyo FM.



Прадстаўнік радыёкампаніі пракаментаваў, што падчас сваёй перадачы Муракамі будзе ставіць музыку, якую ён сам слухае падчас прабежкі.

Паколькі пісьменнік практычна не дае інтэрв'ю пад запіс, навіна была ўспрынятая на «ўра!».

Харукі Муракамі даўно захапляецца бягом на доўгія дыстанцыі (нягледзячы на свае 69 гадоў!). Ён нават прабягаў ультрамарафон (100 кіламетраў!) вакол возера Сарома ў Японіі.

Нярэдка ён піша артыкулы для папулярных часопісаў на тэму забегаў. У літаратара нават ёсць кніга пад назвай «Пра што я кажу, калі кажу пра бег».

Паводле яго слоў, гэта збор «замалёвак пра бег, а не сакрэтаў здаровага ладу жыцця».

З той жа фірмовай лёгкасцю і недаказанасцю, віртуозна балансуючы на мяжы бытавога нарысу і алегорыі, Муракамі фіксуе свае разважанні, якія набываюць праз штодзённае паўтарэнне «нейкую медытатыўную сутнасць».

«Шчыра пісаць пра бег, — кажа ён, — азначае шчыра пісаць пра самога сябе».

«...я ўсё роўна буду ўцякаць да таго часу, пакуль мне гэта будзе па сілах. Людзі могуць казаць што хочуць, мяне гэта не хвалюе. Кожнаму сваё: скарпіён джаліць, цыкада чапляецца за дрэва, ласось вяртаецца на нераст у родную раку, дзікія гусі выбіраюць сабе пару на ўсё жыццё».

Харукі Муракамі — вялікі знаўца музыкі, у яго калекцыі каля 40 тысяч джазавых пласцінак. Пісьменнік прызнаваўся, што можа слухаць джаз па 10 гадзін у дзень.

У рамане «На поўдзень ад мяжы, на захад ад сонца» галоўны герой — уладальнік джаз-бара. Што характэрна, Муракамі сам некалькі гадоў кіраваў сваім джаз-клубам.

Пісьменнік таксама любіць класіку рок-музыкі. А адзін з самых вядомых раманаў «Нарвежскі лес» названы ў гонар знакамітай песні «Norwegian Wood» гурта «The Beatles».

Сёлета ўсе тры кнігі выйшлі ў фармаце «еўрапакет» у міжнароднай серыі, якую аформіў знакаміты мастак Нома Бар (Noma Bar).

Біл Клінтан і палітычны трылер

Паводле паведамлення «The Washington Post», у Тэатры Ўорнера ў Вашынгтоне экс-прэзідэнт ЗША Біл Клінтан прадставіў палітычны трылер «The President Is Missing» («Прэзідэнт знік»), створаны ім у суаўтарстве з адным з самых паспяховых пісьменнікаў свету Джэймсам Патэрсанам.

Сюжэт такі: Амерыка зноў падвергнулася кібератацы, і толькі прэзідэнт можа выратаваць краіну.

Клінтан раней выдаў 4 кнігі, прычым адна з іх — «Маё жыццё» — стала бэстсэлерам. Вострасюжэтны раман «Прэзідэнт знік» стаў яго першай мастацкай кнігай. Аднак гэта ўжо не першы раман з вобласці мастацкай літаратуры, напісаны амерыканскім прэзідэнтам, хай і былым: у 2003 годзе Джымі Картэр апублікаваў сур'ёзны раман пра вайну за незалежнасць пад назвай «The Hornet's Nest» («Гняздо шэршняў»), а цяперашні прэзідэнт ЗША Дональд Трамп з'яўляецца майстрам аўтаэратычнай фантазіі.

Тым не менш, кніга «The President Is Missing» з'яўляецца незвычайнай падзеяй. Як паведамляюць выдаўцы, гэта першы раман, «які інфармуе пра такія інсайдэрскія дэталі, аб якіх можа ведаць толькі прэзідэнт».

Па словах Біла Клінтана, у кнізе падрабязна апісана жыццё ў Белым доме: ад боўлінга ў склепе да бегавых дарожак у спальні прэзідэнта. Ён сказаў: «Мы сапраўды пастараліся апісаць гэта як мага больш дакладна».

У інтэрв'ю BBC Клінтан распавёў, што пасля прагляду тэлесерыялаў пра жыццё ў Белым доме захацеў паказаць рэальнае жыццё прэзідэнта: «Я паглядзеў першыя некалькі сезонаў«Картачнага доміка». Першы быў добры, вельмі добры». І дадаў: «Я доўга глядзеў«Скандал». Многія працавалі над ім — мае сябры і паплечнікі. Але калі я глядзеў абодва серыялы, я думаў: о божа, многія вырашаць, што гэта нармальна, што людзі ў Белым доме забіваюць іншых людзей. Магчыма, нават прэзідэнт кагосьці забіў. І тады яны не ўспрымуць той факт, што ёсць людзі, якія устаюць кожны дзень і робяць тое, што, як яны думаюць, правільна».

Як прызнаўся абраны на пасаду прэзідэнта ў 1992 годзе Клінтан, праца прэзідэнта — магчыма, самая цяжкая ў свеце. Ён падкрэсліў: «Я хачу, каб чытачы ўбачылі, што гэта рэальныя людзі, якія робяць рэальную працу. Яны прымаюць рашэнні. І іх рашэнні ўплываюць на вашыя жыцці».

Былы прэзідэнт ЗША паведаміў: «Я люблю трылеры. Я чытаю іх у велізарнай колькасці. Вось толькі што скончыў трэцюю кнігу ў трылогіі «Чырвоны верабей» [Джэйсана Мэцьюс]». Ён таксама заявіў, што «фанацее» на Патэрсану і залпам праглынуў усе яго 25 кніг пра псіхолага-дэтэктыва Алекса Крос. Біл Клінтан распавёў: «Я асабліва не захапляўся крымінальнымі і вострасюжэтнымі раманамі да пачатку 1980-х, а потым цалкам пагрузіўся ў іх». З тых часоў Біл Клінтан, паводле яго слоў, песціў мару напісаць уласную кнігу. Ён прызнаўся: «Я заўсёды гэтага хацеў».

Кніга вершаў да 70-годдзю Ізраіля

Паэтычная анталогія «70», прысвечаная 70-годдзю заснавання Дзяржавы Ізраіль, пабачыла свет у Нью-Ёрку.

У яе ўвайшлі вершы 70 рускамоўных сучасных паэтаў з 14 краін свету: Ізраіля, ЗША, Расіі, Украіны, Беларусі, Латвіі, Эстоніі, Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Італіі, Швецыі, Ірландыі і Аўстраліі, якія пісалі пра Ізраіль, яго гісторыю, народ, традыцыі і культуру.

Адзін з арганізатараў праекта і заснавальнікаў руска-амерыканскага выдавецтва «KRiK Publishing House», якое выпусціла кнігу, Рыка Кацова ў гутарцы паведаміла: «У анталогію ўвайшлі вершы на тэму Ізраіля і яўрэйства сучасных аўтараў. Сярод іх — Вераніка Даліна, Аляксандр Гарадніцкі, Навум Каржавін, Уладзімір Гандэльсман і многія іншыя вядомыя паэты».

Выдавец таксама дадала: «Усе тэксты, сабраныя ў анталогіі, зусім розныя як па стылі, так і па настроі. Аўтары закранаюць тэмы гісторыі і традыцый, Халакоста, эміграцыі і іміграцыі, паўсядзённага жыцця Ізраіля і ўражанняў ад яго наведвання. У тэкстах прасочваюцца яўрэйскія лёсы і характары, пакуты народа і яго нязменная здольнасць пасмяяцца з сябе. Кніга атрымалася такой жа эклектычнай, як і сам Ізраіль, дзе зусім арганічна суіснуюць тысячагадовая гісторыя і суперсучасныя дасягненні ў самых розных галінах, старадаўнія традыцыі і нястрымная энергія маладой дзяржавы».

Праект быў прэзентаваны 8 мая ў Нью-Ёрку, а 12 чэрвеня — у Іерусаліме.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by